

КУЛЬТУРА Ў ЭПОХУ ПАНДЭМІІ 9

У ЧЫМ ФЕНОМЕН ГАРНАЛЫЖНАГА СПОРТУ? 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 СТУДЗЕНЯ 2021 г. СУБОТА № 13 (29382)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Фарміруючы вобраз Беларусі будучага, неабходна ўлічваць, што вырасла новае пакаленне — больш прасунутае і амбіцыйнае, больш індывідуалістычнае, адкрытае ўсяму свету, а таму, магчыма, і больш слабае. Яны хочуць будаваць дзяржаву ў смартфоне, актыўна ўкараняючы лічбавыя тэхналогіі ў штодзённае жыццё. Для іх важна бачыць дзяржаву партнёрам, умацоўваючы дыялог і ўзаемны давер дзяржаўных інстытутаў і грамадства. Хачу заўважыць, што гэтыя і іншыя пазіцыі адлюстраваны ў прапанаванай Праграме на наступнае пяцігоддзе. Больш за тое, аб'яўлены Прэзідэнтам Год народнага адзінства толькі ўзмоцніць гэты трэнд і дасць магчымасць уключыць у працэс выпрацоўкі і рэалізацыі патрэбных для краіны рашэнняў шырокае кола неабыякавых, актыўных людзей. Бо адзінства — гэта не калі ўсе думаюць аднолькава, а калі ёсць агульная мэта, агульная ідэя, накіраваная не на разбурэнне, а на захаванне і прымнажэнне ўжо зробленага...»*

# Зіма ў гасцінным дворыку



Дзесяць гадоў таму Антаніна СТЭЛЬМАХ, калі выйшла на заслужаны адпачынак, вярнулася ў вёску свайго дзяцінства — Замошша Чашніцкага раёна, быццам бы ведала, што стане тут запатрабаванай — старэйшынай невялікага населенага пункта. Для месцічаў, а цяпер у вёсцы іх пражывае толькі восем, Антаніна Аляксандраўна стала самым надзейным сябрам, нават, можна сказаць, родным чалавекам. Вяртаючыся на радзіму, яна яшчэ не ведала, што яе чакаюць цікавая пошукавая работа і стварэнне летапісу сваёй малой радзімы. Дзякуючы Антаніне Стэльмах і яе захапленню мінулым, вялікімі і малымі падзеямі і выбітнымі продкамі-землякамі сабрана вялікая колькасць інфармацыі для кнігі-альманаха (выданне ўжо ўбачыла свет два гады таму). Цяпер старэйшына руплівіца, каб папоўніць летапіс новымі звесткамі і фактамі, якія абавязкова ўвойдуць у будучае перавыданне гэтага зборніка.

На сваім падворку, калі зіма пачынае гаспадарыць ва ўсю моц, Антаніна заўсёды лепіць снегавіка. Вось і сёлета ў Замошшы таксама з'явіўся гэты добры і вясёлы сімвал зімы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Пяць мадэляў трактароў МТЗ прайшло сертыфікацыйныя выпрабаванні для выхаду на рынак Еўрапейскага саюза.**
- «Зімовы маршрут» БРСМ стартуе ў Гродне 23 студзеня.
- **Санаторыі і аздараўленчыя цэнтры БЧ у 2020 годзе прынялі больш за 14,5 тыс. чалавек.**

Педагагічная майстэрня

# ЭФЕКТНЫ І ЭФЕКТЫЎНЫ ЎРОК

Ці можна паміж імі паставіць знак роўнасці?

**Па самых прыблізных падліках, за час сваёй вучобы ў школе дзіця наведвае больш як 10 тысяч самых розных урокаў. Як гэтым бясцэнным патэнцыялам распараджаюцца настаўнікі?**

### НЕ ЗДЗІВІЦЬ, А НАВУЧЫЦЬ!

Ёсць тры блізкія абазначэнні ўрока: эфектны, выніковы і эфектыўны. Ці ёсць паміж імі розніца?

— Эфектны — той, які кідаецца ў вочы, запамінаецца. Але на такім занятку акцэнты перамяшчаюцца на знешні антураж, — разважае **прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай ЗАПРУДСКІ.** — Чаму некаторыя аўтары адкрытых урокаў аддаюць перавагу эфектнасці? Па-першае, фармалізм — характэрная асаблівасць паводзін і дзейнасці многіх людзей. Па-другое, ёсць у настаўнікаў натуральнае жаданне падабацца знешнім экспертам: адміністрацыі, калегам, членам журы ці экзаменацыйнай камісіі. Яны лічаць, што тыя хочуць убачыць менавіта эфектнасць, і таму можна разлічваць на высокія балы. Па-трэцяе, сапраўды сустракаюцца такія ацэншчыкі, для якіх бачнасць кіпучай дзейнасці настаўніка больш важная за работу вучняў. Я з'яўляюся членам журы Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» з 1990-х гадоў і заўважаю, што для некаторых маіх калег важна, каб настаўнік на ўроку дамінаваў, але з кожным годам такіх членаў журы становіцца менш, бо на ўроку важна не здзівіць інавацыйнымі прыёмамі і сродкамі навучання, а навучыць!

СТАР. 4

Дабрыня

# Дапамога — ёсць!

Чым займаецца гэтай зімой Беларускі Чырвоны Крыж

**Нядаўнія маразы для многіх сталі выпрабаваннем на трываласць. Асабліва цяжка перажыць капрызы нашай зімы найбольш уразлівым катэгорыям грамадзян — у першую чаргу так званым асобам без пэўнага месца жыхарства, або папросту бяздомным. Менавіта людзі, у якіх няма даху над галавой, у першую чаргу маюць патрэбу ў падтрымцы ў экстрэмальных умовах надвор'я — і ім на дапамогу прыйшлі валанцёры Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Пра гэты і іншыя напрамкі работы мы гутарым з афіцыйным прадстаўніком Беларускага Чырвонага Крыжа Віталем ДЭМБОЎСКІМ.**

СТАР. 7




ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Рашэнні прыняты, але неабходна сканцэнтравацца на іх рэалізацыі»

## Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц далажыў Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку аб развіцці рэгіёна

**Прэзідэнт адзначыў, што яшчэ пры назначэнні на пасаду галоўнай задачай кіраўніка Магілёўшчыны было вывесці вобласць на дастойны ўзровень, каб рэгіён «не плёўся ў хвасце». Па яго словах, вобласць «не надта рванула», але ўсё ж дадала па ВУП за мінулы год.**

«Адзіная, мабыць, вобласць, — ды і ў свеце мала дзяржаў, якія б па ВУП дадалі за мінулы год. Усюды падзенне. Кітай 2,5 працэнта дадаў, але не 7-8 працэнтаў, як гэта было раней», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што Магілёўшчына па валавым рэгіянальным прадукце спрацавала амаль на 101 %. «Нядрэнны паказчык, і ў гэтых адносінах трэба аддаць належнае, але ўсе астатнія паказчыкі ў нас могуць быць лепшыя. Таму бачыць толькі станоўчае і не звяртаць увагі на тое, дзе трэба напружвацца, будзе няправільным. Мы тады проста спынімся ў развіцці», — дадаў кіраўнік краіны.

«Але тое, што вам удалося магіляўчан расштурхаць, — гэта неаспрэчны факт. Па многіх кірунках на рэспубліканскім узроўні былі прынятыя рашэнні, што датычыліся Магілёўшчыны. Напрыклад, паўднёвы ўсход Магілёўшчыны — адпаведныя прэферэнцыі, падтрымка, праекты па прадпрыемствах, падтрымка ў сацыяльнай сферы. Як кажуць, наверсе рашэнні прыняты, але неабходна сканцэнтравацца на іх рэалізацыі», — заявіў кіраўнік краіны.

Ён пацікавіўся у губернатара ўражаннямі за перыяд работы на пасадзе і яго бачаннем таго, што неабходна зрабіць, каб вобласць яшчэ дадала ў развіцці.

«Прашу мець на ўвазе, Леанід Канстанцінавіч, як я ўчора (на нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў. — **«Зв.»**) казаў: 2021 год асаблівы. Асаблівы тым, што абсалютна невыразны. Вызначанасцяў ніякіх няма. Мы не ведаем, як будзе развівацца сусветная эканоміка», — папярэдзіў Прэзідэнт. Ён папрасіў улічваць у рабоце не толькі гэтыя фактары, але і абмежаванасць сродкаў, і ціск на краіну звонку і знутры. «Мы, канешне, на калені не ўстанем, не рухнем, гэта адназначна. Але ў развіцці павінны гэта ўлічваць. Трэба мабілізаваць усё тое, што ёсць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

### Каментарый у тэму

Па словах **старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Леаніда ЗАЙЦА,** валавы рэгіянальны прадукт у памеры 100,9 % — найлепшы вынік па краіне за 2020 год. Пры гэтым сельская гаспадарка забяспечыла рост — 105,5 % ва ўсіх катэгорыях гаспадарак, сельгаспрадпрыемствы — 108,8 %, прамысловасць — 103,4 %, гандаль — 100,7 %. Усё гэта дало магчымасць павысіць заробкі ў рэгіёне на 13 %.

«Канешне, гэта недастаткова, яшчэ шмат рэзерваў. Мы гэта бачым, усе недахопы. Усе ўпушчэнні з'яўляюцца нашымі рэзервамі для павелічэння і колькасных, і якасных паказчыкаў. Уся наша наступная дзейнасць — аграрнікаў, прамыслоўцаў, усіх жыхароў Магілёўскай вобласці — будзе накіравана на паляпшэнне паказчыкаў», — сказаў журналістам Леанід Заяц.

Ён расказаў і пра дасягненні паўднёвага ўсходу Магілёўшчыны, развіццю якога аддаецца асаблівая ўвага. Губернатар падкрэсліў, што гэтыя тэрыторыі добра працавалі ў земляробстве і прыраслі па збожжы ў 1,4 раза, у 1,6 раза — па рапсе, нарыхтавалі больш кармоў, павялічылася выручка на аднаго работніка на 20,3 %, выраслі заробкі.

«Але гэтага ўзроўню развіцця недастаткова, каб можна было зраўняцца нават з сярэднімі абласнымі паказчыкамі. Таму праграма, якая прынята, і тыя нормы ўказа, што закладзены, дазволяць нам на працягу будучай пяцігодкі выраўняць паказчыкі, а па некаторых нават выйсці наперад», — паведаміў Леанід Заяц.

Ва ўрадзе

# На шляху да мадэрнізацыі

## Увод у эксплуатацыю комплексу запаволенага каксавання на «Нафтане» кампенсуе страты ад падатковага манеўру

**Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА пасля наведвання нафтапрамысловага прадпрыемства. Як перадае прэс-служба ўрада, кіраўнік урада адзначыў, што комплекс запаволенага каксавання — аб'ект вельмі складаны, і яго будаўніцтва зацягнулася на некалькі гадоў.**

«Плануем у маі скончыць будаўніча-мантажную частку і неадкладна прыступіць да пуска-наладкі. У найлепшым выпадку да пачатку чацвёртага квартала гэтага года, а калі складанасці паўстануць, то да канца года, маем намер выйсці на атрыманне першага прадукту ад гэтай установкі», — адзначыў Раман Галоўчанка.

Каб кантраляваць інвестпраект і пазбягаць адставанняў, кожныя два тыдні на «Нафтане» працуе штаб пад кіраўніцтвам міністра архітэктуры і будаўніцтва Руслана Пархамовіча і старшыні канцэрна «Белнафтахім» Андрэя Рыбакова.

Таксама падчас паездкі на Віцебшчыну Раман Галоўчанка ўзяў удзел у адкрыцці вытворчасці высокаліквіднай экалагічна чыстай прадукцыі па традыцыйных і новых тэхналогіях у Верхнядзвінскім раёне. Прэм'ер-міністру далажылі аб рабоце ТАА «Чырвоны Бор ЭкаПрадукт», канцэпцыі яго развіцця, асноўнай дзейнасці і наменклатуры прадукцыі.

Рэалізаваны інвестпраект завяршае поўны цыкл аховы, аднаўлення папуляцыі, здабычы дзікіх жывёл, перапрацоўкі мяса і рэалізацыі канчатковаму спажыўцу высакаякасных экапрадуктаў з мяса дзічыны.

Марыя ДАДАЛКА.

# На сем'ях дзяржава не эканоміць

**Маштабная і рознабаковая падтрымка сем'яў з дзецьмі — візітная картка Беларусі. І нават у няпростых эканамічных умовах на сем'ях дзяржава не эканоміла і не будзе эканоміць. Пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА, вітаючы ўдзельнікаў рэспубліканскага адкрытага дыялогу «Шматдзетная сям'я — прыярытэт дзяржаўнай сямейнай палітыкі», які праходзіць у палацавым ансамблі Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», перадае карэспандэнт БелТА.**

«Аснова для павышэння эканамічнага патэнцыялу сем'яў з дзецьмі створана. Інвеставаны значныя сродкі па ўсіх жыццёва важных для іх кірунках, — адзначыў Ігар Петрышэнка. — Толькі летась на падтрымку сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, было накіравана каля Br4,65 мільярда бюджэтных сродкаў. Гэта тры працэнты ВУП».

Ён заклікаў удзельнікаў сустрэчы актыўна ўключацца ў абмеркаванне: як зрабіць так, каб шматдзетных сем'яў рабілася больш, а іх уладкаванне была больш камфортнае. На сустрэчы прысутнічалі шматдзетныя бацькі — 20 сем'яў з усіх рэгіёнаў краіны.

«У бягучай пяцігодцы ўрад прагне працаваць над рашэннем ключавых для нашых сем'яў пытанняў. Нам неабходна забяспечыць даступнасць розных відаў жылля, асабліва для маладых сем'яў», — дадаў Ігар Петрышэнка. Асноўныя прыярытэты адлюстраваны ў асноўным праграмным дакуменце краіны — Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады, праект якой вынесены на ўсенароднае абмеркаванне напярэдадні VI Усебеларускага народнага сходу, — заўважыў намеснік прэм'ер-міністра.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЕС могуць зноў забараніць «неістотныя паездкі»

Саміт ЕС, які прайшоў у рэжыме відэаканферэнцыі, завяршыўся дасягненнем пэўнага кансенсусу. Ва ўмовах развіцця пандэміі гэта дазволіць супольнасці пазбегнуць пагранічнага хаосу, які назіраўся падчас першай хвалі COVID-19. Мэта заключаецца ў тым, каб кантраляваць распаўсюджанне віруса без прыпынення дзеяння Шэнгенскіх правілаў. Лідары краін Еўрасаюза пагадзіліся, што граніцы павінны быць адкрытыя, але прызналі верагоднасць новага строгага абмежавання «неістотных паездак». Гэта адносіцца як да знешніх, так і да ўнутраных граніц ЕС. Што датычыцца паездак з трэціх краін, якія не ўваходзяць у супольнасць, то да адпраўлення ўсім неабходна будзе зрабіць тэст ПЛР.

### У ЗША больш за 120 чалавек абвінавацілі ў арганізацыі беспарадкаў



Абвінавачанні ў арганізацыі беспарадкаў у Вашынгтоне і ў захопе Капітолія 6 студзеня прад'яўлены ўжо больш чым 120 жыхарам ЗША. Пра гэта, як паведаміла тэлекампанія CNN, Міністэрства юстыцыі праінфармавала адміністрацыю прэзідэнта Джозэфа Байдэна. Характар абвінавачанняў вар'іруецца ад незаконнага пранікнення ў будынак Кангрэса ЗША да нападу на паліцэйскіх. Некаторым падсудным, адзначае тэлекампанія, інкрымінуюцца і больш сур'ёзныя абвінавачанні — арганізацыя змовы і пагрозы здзяйснення гвалтоўных дзеянняў. Прадстаўнікі Мінюста апавясцілі новую адміністрацыю пра тое, што «агульнанацыянальныя пошукі» падазраваных будуць працягнуты.

### Брытанскія кампаніі ўцякаюць з каралеўства

Каля 50 брытанскіх кампаній пераехала ў Францыю. Яны пачалі ўцякаць з-за «брэксіту». Пра гэта заявіў кіраўнік Банка Францыі Франсуа Вілеруа дэ Гал. «Брэксіт» дапамог французскай эканоміцы перавабіць частку брытанскіх кампаній і іх актывы (сумарна на 170 мільярдаў еўра), сёлета гэты працэс паскорыцца, упэўнены кіраўнік ЦБ. Амаль 2,5 тысячы рабочых месцаў ужо былі пераведзены з Вялікабрытаніі ў Францыю. За першыя восем месяцаў мінулага фінансавага года дзяржаўныя пазыкі Вялікабрытаніі павялічыліся да рэкордных 240,9 мільярда фунтаў стэрлінгаў (323 мільярда долараў). Краіна сутыкнулася з самым вялікім бюджэтным дэфіцытам за ўсю сваю гісторыю (у мірны час).

Добрая навіна

# Бальніцы вяртаюцца да звычайнага рэжыму

**На гэтым тыдні ў рэгіёнах Беларусі паступова паляпшалася эпідэмічная абстаноўка. Некаторыя аддзяленні бальніц пачынаюць працаваць у звычайным рэжыме. Аднак да перапрафілявання ў рэгіёнах падыходзяць узважана, бо ў лютым штогод адзначаецца сезонны пад'ём захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.**

У Брэсцкай вобласці цалкам прайшлі працэдуру дэзынфекцыі і аднавілі работу ў звычайным рэжыме цэнтральныя раённыя бальніцы Жабінкаўскага, Камянецкага і Маларыцкага раёнаў.

На Віцебшчыне з 18 студзеня аднавілі работу ў звычайным рэжыме 86 ложкаў у цэнтральных раённых бальніцах. З 21 студзеня цалкам працуе ў штатным рэжыме Віцебскі абласны спецыялізаваны цэнтр. З 25 студзеня аднаўляе работу Віцебскі абласны рэабілітацыйны цэнтр для інвалідаў і ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых краін.

У Гродзенскай вобласці да звычайнага рэжыму работы вяртаецца Гарадская клінічная бальніца № 3 Гродна. Цяпер тут праводзяцца дэзынфекцыйныя і падрыхтоўчыя мерапрыемствы. Працаваць у звычайным рэжыме клініка пачне з 22 студзеня. Прымаць пацыентаў пачнуць неўралагічнае, тэрапеўтычнае, кардыялагічнае і псіханеўралагічнае аддзяленні. Цяпер у рэгіёне для звычайнага рэжыму работы перапрафілявана больш за 300 ложкаў.

У Гомельскай вобласці дадаткова вернуты ў звыклы рэжым функцыянавання: з 21 студзеня — аддзяленне паталогіі цяжарнасці Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 1 з далейшым паэтапным перапрафіляваннем у звычайны рэжым усёй медустановы, а з 22 студзеня — кардыялагічнае аддзяленне на 30 ложкаў у Мазырскай гарадской бальніцы.

У Магілёўскай вобласці на гэтым тыдні праходзіла дэзынфекцыя ў Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы, з 24 студзеня яна мусіць прымаць профільных пацыентаў. Таксама на гэтым тыдні Бабруйскі міжраённы анкалагічны дыспансер будзе праводзіць мерапрыемствы па вяртанні да звычайнага рэжыму работы.

На Мінршчыне планнуе вяртанне да звыклай работы Валожынская цэнтральная раённая бальніца. Першае аддзяленне на 20 ложкаў праходзіць дэзынфекцыю. Таксама адкрываюцца першыя профільныя аддзяленні на 100 ложкаў у Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы. А з 29 студзеня плануецца адкрыць для планавага прыёму першыя 20 ложкаў у Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы. Акрамя таго, плануецца перапрафіляваць пасля работы з COVID-19 і першыя аддзяленні ў Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы ў Атоліна.

У сталіцы адкрываюцца для профільных пацыентаў гарадская гінекалагічная бальніца, раддом № 2, а таксама 11-я бальніца. Плануецца, што ў 11-й бальніцы будуць адкрыты месцы для рэабілітацыі на 185 ложкаў. Акрамя таго, мяркуецца адкрыць з 25 студзеня 60 ложкаў уралагічнага аддзялення ў 4-й бальніцы. У планах пераход на звычайны рэжым работы з 1 лютага аддзяленняў 1-й гарадской бальніцы — кардыялагічнага, нефралагічнага, рэўматалагічнага і эндакрыналагічнага. Таксама плануецца, што ў гэты час адкрыецца гарадскі цэнтр астэапарозу.

Алена КРАВЕЦ.




# Прывабіць інвестара ў глыбінку

## На сустрэчы ўдзельнікаў шостага Усебеларускага народнага сходу ў Брэсце абмеркавалі шляхі рэгіянальнага развіцця

**Абласны сход праходзіў у двайным фармаце з улікам эпідэміялагічнай абстаноўкі. Адна частка дэлегатаў была на відэасувязі ў студыях сваіх раёнаў, а дэлегаты ад Брэста і Брэсцкага раёна, Маларыцкага, Камянецкага і Жабінкаўскага раёнаў сабраліся ў зале аблвыканкама. Адкрыў пасяджэнне старшыня Брэсцкага абласнога Савета Юрый НАРКЕВІЧ. Ён паведаміў, што ад Брэстчыны на сход абрана 310 дэлегатаў. З іх 186 — дэпутаты Саветаў розных узроўняў, 124 чалавекі вылучаны грамадскімі аб'яднаннямі і арганізацыямі. Кіраўнік прадстаўнічай улады нагадаў удзельнікам іх задачу — дастойна прадставіць вобласць на Усебеларускім сходзе, а затым мабілізаваць грамадства на выкананне вызначаных сходам задач наступнай пяцігодкі.**

**Міністр эканомікі краіны Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** коратка ахарактарызаваў палажэнні праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады, якія будуць разгледжаны на агульным форуме, расказаў, якім чынам і якімі спецыялістамі гэтая праграма распрацоўвалася. Міністр адзначыў, што прадстаўлены праект уяўляе з сябе контуры будучай праграмы. Яна будзе дапрацоўвацца і крышталізавацца ў ходзе работы Усебеларускага сходу з улікам меркаванняў яго ўдзельнікаў, прапаноў, якія паступілі ў ходзе работы дыялогавых пляцовак. Так будзе выбудаваны канчатковы варыянт праграмы, таму ўнесці прапанову, узняць праблему яшчэ не позна.

Аляксандр Чарвякоў адзначыў у ліку галоўных задач дзяржавы яе сацыяльную арыентаванасць. Паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва непасрэдна звязана з развіццём галіны аховы здароўя. Прыйшоў час высокатэхналагічнай медыцыны ў рэгіёнах. З 12 міжрэгіянальных цэнтраў аказання спецыялізаванай дапамогі, якія будуць створаны ў краіне за пяць гадоў, тры адкрыюцца на Брэстчыне — у Пінску, Брэсце і Белаазёрску.

У плане ўмацавання эканамічнага патэнцыялу прадугледжваецца кластарызацыя, маецца на ўвазе сістэма ўзаемадзеяння, якая аб'ядноўвае навуку, прыватны бізнес, бюджэтныя дзяржкарпарацыі. У рэгіёнах таксама з'явяцца кластары. У тым ліку два на Брэстчыне: адзін — у сферы біятэхналогій і «зялёнай» эканомікі на базе Палескага ўніверсітэта і тэхнапарка «Палессе», другі — мэблевы кластар на базе прадпрыемства «Івацэвічдрэў».

Будаваць любую праграму развіцця можна, несумненна, толькі абапіраючыся на фундамент дасягненняў. На гэтым зрабіў акцэнт у сваім выступленні **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ.** Ён коратка падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці за апошнія гады і тэзісна агучыў галоўныя задачы. Віцэ-губернатар адзначыў, што ў вобласці сфарміраваны партфель з 322 інвестыцыйных праектаў (уключаючы ўжо пачатыя) на суму больш за чатыры мільярды рублёў. Палова праектаў інфраструктурныя. У іх рэалізацыю інвестары маюць намер укласці каля двух мільярдаў рублёў. У вытворчай сферы плануецца рэалізаваць 79 праектаў. Напрыклад, у Пінску будуюць завод па выпуску зліткаў монакрышталічнага крэмнію, у Івацэвічах інвестар працуе над пашырэннем вытворчасці мяккай мэблі, у Кобрынскім раёне ўзводзяць сельскагаспадарчы комплекс па вырошчванні грыбніц. Ёсць планы на рэалізацыю шэрагу інвестпраектаў і ў сельскай гаспадарцы рэгіёна.

Варта адзначыць, што на абласным сходзе адбылася канструктыўная дыскусія. Нямала пытанняў удзельнікі задавалі міністру эканомікі, намесніку міністра архітэктуры і будаўніцтва Алегу Швяцу, намесніку міністра працы і сацыяльнай абароны Валерыю Кавалькову, намесніку міністра ЖКГ Віталю Смірнову, якія прысутнічалі на пасяджэнні. Напрыклад, Аляксандр Раманюк, генеральны дырэктар КУП «Брэстжылбуд», узняў надзвычай вострае пытанне тэхнічнага пераўзбраення будаўнічых арганізацый. Відавочна, гэтае пытанне наспела, бо апошняя маштабная мадэрнізацыя была каля дзесяці гадоў таму. З адказаў кампетэнтных асоб вынікала, што праблема знаходзіцца на кантролі, шляхі яе вырашэння вызначаныя.

Шмат гаварылі ўдзельнікі сходу пра развіццё глыбінкі, малых і сярэдніх населеных пунктаў вобласці. Імпульс гэтай дыскусіі задаў **Валерый ВАКУЛЬЧЫК, памочнік Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці:** «Крыніцай унікальнасці і самабытнасці нашай краіны з'яўляюцца малыя і сярэднія населеныя пункты. А каб яны жылі, развіваліся, там патрэбная вытворчасць, новыя рабочыя месцы. Стымуляваць інвестара можна хіба толькі пэўнымі льготамі і прэферэнцыямі. Трэба, каб бізнесмену было выгадна адкрыць сваю вытворчасць не ў ваколіцах Брэста, а, умоўна кажучы, у Олтушы Маларыцкага раёна». Міністр эканомікі паведаміў, што над гэтым працуе рабочая група, рыхтуецца праект Указа па падыходах да развіцця рэгіёнаў. Вытворчасць павінна рухацца ад сталіцы, абласных гарадоў у правінцыю. Тут, вядома, важным фактарам выступае наяўнасць сучасных дарог. Завод альбо фабрыка можа ўзнікнуць ў гадзіне язды ад добраўпарадкаванага населенага пункта. Гаварылася на нарадзе і пра перспектывы развіцця Брэсцкага рэгіёна як важнага памежнага пункта еўразійскага напрамку. Прыйшоў час стварэння вытворча-лагістычнага пояса.

Пытанне развіцця самакіравання ўзняла **старшыня Дзівінскага сельскага Савета Кобрынскага раёна Вера ПІКУЛА.** Вера Пятроўна лічыць цяперашнюю мадэль пабудовы мясцовай улады аптымальнай. Яна прадэманстравала гэта на прыкладзе работы дэпутатаў свайго Савета. З дзівінскай старшынёй не пагадзіўся Валерый Вакульчык. Ён лічыць, што падыходы да мясцовага самакіравання на вёсцы трэба мяняць, кіраўнік сельвыканкама павінен мець больш паўнамоцтваў і несці большую адказнасць за стан спраў на вёсцы. Памочнік Прэзідэнта прывёў прыклад суседняга з Дзівінскім сельсавета, жыхары якога сваіх дэпутатаў не ведаюць нават па прозвішчах, а скаргі на няўважлівае стаўленне да сваіх патрэб па развіцці падсобнай гаспадаркі вымушаны накіроўваць у рэспубліканскія інстанцыі.

Свае падыходы да развіцця рэгіёна ў кантэксце краіны агучылі **дырэктар Брэсцкага навукова-тэхналагічнага парка Дзмітрый МАКАРУК** і іншыя ўдзельнікі сходу.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ** у размове з журналістамі адзначыў, што сфарміраваць вобраз Беларусі будучага магчыма з прыцягненнем грамадзян краіны ўсіх узростаў, усіх сацыяльных груп. На яго думку, Усебеларускі народны сход для гэтага найлепш падыходзіць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Слова — дэлегатам

# «Самае галоўнае — навучыцца чуць адно аднаго»

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Тэнгіз ДУМБАДЗЭ:**



Фота БелТА.

— Літаральна толькі што завяршылася чарговая дыялогавая пляцоўка на базе Мінскага трактарнага завода. Адбылася вельмі цікавая сустрэча, якая доўжылася амаль тры гадзіны. Большасць яе ўдзельнікаў — моладзь. Яны запрасілі нас, каб абмеркаваць актуальныя, на іх погляд, пытанні, якія мы маглі б узняць перад Усебеларускім народным сходам.

Хачу адразу сказаць, і мне гэта вельмі прыемна, што рыторыка сустрэчы была патрыятычная.

Так, прыйшлося правесці своеасаблівую паўгадзінную лекцыю, падчас якой я расказаў пра сваю журналісцкую дзейнасць: што ўбачыў, да чаго прыводзяць рэвалюцыі. Я сказаў, што мы гатовыя да эвалюцыі, да перамен, але рэзка змяняць штосьці нельга. Усе з гэтым пагадзіліся.

Вельмі актыўна абмяркоўвалі балючае рашэнне Савета IIHF (Міжнароднай федэрацыі хакея) аб пераносе чэмпіянату свету — 2021 з Беларусі. Усе са шкадаваннем канстатавалі, што гэта не самае мудрае рашэнне.

Адна з праблем, якую моладзь хацела б падняць перад народным форумам, датычыцца заробкаў. Трэба сказаць, што заробкі на МТЗ адносна нядрэнныя, але гаворка ішла пра тое, што іх не хапае на набыццё ўласнага жылля. Адбылася цікавая палеміка паміж самімі маладымі людзьмі. Апаненты пыталіся: чаму тыя, каму не хапае грошай, не шукаюць дадатковых магчымасцяў? Бо жыллё — гэта дабро, якое чалавек стварае сабе сам. Дзяржава дапамагае: забяспечвае прымальныя працэнтныя стаўкі крэдытаў, дае льготы. Але асноўны клопат па забеспячэнні жылля павінен легчы на плечы таго, хто мае ў ім патрэбу. Ніхто гатовае на спадачку не дасць.

Вядома, хочацца, каб мы пабудавалі такую краіну, дзе кожная сям'я магла б лёгка вырашыць жыллёвае пытанне. Але пакуль тое недасягальна не толькі ў нас. Напэўна, няма ў свеце ідэальнай у гэтым плане дзяржавы.

Шмат казалі пра палітыку, пра палітычную сімволіку. Відаць, як тое, што адбываецца ў краіне, хвалюе беларускую працоўную моладзь.

Я гаварыў аб тым, што трэба шанаваць іншае меркаванне, але важна заставацца патрыётамі і любіць сваю Радзіму, захоўваць яе. Гэтага ніхто не зробіць за нас. І ніхто, акрамя нас, не зробіць яе лепшай. Самае галоўнае — навучыцца чуць адно аднаго, разумець і жыць так, каб стварыць нашчадкам цудоўныя ўмовы для працягу добрых традыцый на роднай беларускай зямлі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЭФЕКТНЫ І ЭФЕКТЫЎНЫ ЎРОК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

А які ўрок можна назваць выніковым? Па логіцы, той, які забяспечвае добры вынік. Урок, на якім дасягнута мэта (па магчымасці, усімі навучэнцамі), можна лічыць выніковым. Але далёка не любы выніковы ўрок з'яўляецца эфектыўным. Калі на яго падрыхтоўку і правядзенне выдаткавана зашмат рэсурсаў, нерваў, часу, матэрыялаў, ён можа быць выніковым, але не будзе эфектыўным.

Мая знаёмая настаўніца працавала вельмі вынікова, калі ацэньваць яе дасягненні па пэўных маркерах: яе выхаванцы перамагалі на розных алімпіядах і інтэлектуальных спаборніцтвах, мелі добрыя вынікі на ЦТ, але ўвесь свой час яна прысвячала рабоце. І калі выйшла на пенсію, сям'і ў яе не было. А ў педагога абавязкова павінен заставацца час на асабістае жыццё, на хобі і падарожжы, у процілеглым выпадку ён працуе неэфектыўна. Дык ці сінонімы словы «эфектыўны» і «выніковы»? — звярнуўся да ўдзельнікаў EdCamp Belarus Мікалай Запрудскі.

## ВЕРА Ў ПОСПЕХ

— Адкрыты ўрок, на падрыхтоўку да якога настаўнік выдаткаваў вельмі шмат рэсурсаў, выніковы, але ён неэфектыўны. Таму што выніковасць — толькі адзін з крытэрыяў эфектыўнасці. Калі мяне запрашаюць на ўрок, на што я звычайна звяртаю ўвагу? Ці працавалі вучні актыўна. Ці ўсе былі ўцягнутыя ў работу. Ці ўяўляе з сябе ўрок сістэму. Ці створана спрыяльнае асяроддзе і псіхалагічны камфорт для дзяцей. Ці забяспечана моцная зваротная сувязь. Магчыма, ёсць і іншыя крытэрыі эфектыўнага ўрока, але гэтыя — галоўныя. Для актыўнай работы вучня на ўроку павінна быць матывацыя, а матывацыя можа з'явіцца, калі дзіця разумее свае патрэбы. Бацька кажа сыну: «Калі ты скончыш чвэрць з адзнакамі не ніжэй за «6», я куплю табе смартфон». Паверце, што стымуляцыя адзнакай працуе зусім нядоўга. А вось матыў, які абапіраецца на патрэбы дзяцей, больш устойлівы.

**«Эфектыўны настаўнік ставіцца да выхаванцаў з цеплынёй, падтрымлівае вачыма і ўсмешкай, дае магчымасць для выбару, прымае іх ідэі, арганізуе на ўроку супрацоўніцтва».**

Я, на жаль, быў на ўроках, дзе настаўнік рабіў усё насуперак патрэбам вучняў. У дзяцей ёсць патрэба ва ўзаемадзеянні, у пошуку, а не ў атрыманні гатовых ведаў, таму пры падрыхтоўцы да ўрока педагог павінен прадумаць, як ён будзе задавальняць патрэбы сваіх вучняў. Эфектыўны ўрок мае сістэмны характар, і калі мы ставім мэту на ўрок, то павінны прадумаць, якімі метадамі і сродкамі яна будзе дасягнута. Таксама на ўроку павінна быць створана асяроддзе, якое спрыяе навучанню школьнікаў.

Я ўпэўнены, што найлепшы падарунак, якім мы можам падзяліцца з блізкімі, — гэта вера ў яго поспех. Каштуе мала, але дорага цэніцца. Упэўнены, што маладыя настаўнікі сыходзяць са школы пасля двух гадоў работы па размеркаванні не толькі з-за невысокіх заробкаў, адсутнасці перспектыў з жыллём, а ў тым ліку з-за таго, што не адчуваюць падтрымкі. Ім не кажуць: «Я веру у твой поспех!» ці «У цябе абавязкова будзе дысцыпліна на ўроках». Кіраўнікі павінны натхняць сваіх педагогаў, а тыя — сваіх вучняў. Эфектыўны настаўнік ставіцца да выхаванцаў з цеплынёй, падтрымлівае вачыма і ўсмешкай, дае магчымасць для выбару, прымае іх ідэі, арганізуе на ўроку супрацоўніцтва, знаёміць вучняў з крытэрыямі, па якіх будзе правярацца іх работа. Я ў кожнай школе ў настаўніцкай размясціў бы «Пазітыўны слоўнік настаўніка» — словы і фразы, якія стымулююць: «Паспрабуй, я ўпэўнены, што ў цябе атрымаецца», «Я ведаю, ты гэта можаш...», «Хутчэй бы ўбачыць, што ў цябе атрымалася!», «Ты на правільным шляху», «Гэта заслужаны поспех, ты добра папрацаваў», «У цябе зноў атрымалася! Здорава!», «Гэта ідэя нам вельмі дапаможа», «Я бачу, як ты стараешся», «Я давяраю табе гэтую справу» і іншыя. Ці трыццаць фраз, якія хочуць чуць дзеці ад сваіх бацькоў і настаўнікаў: «Ты асаблівы (унікальны)», «Будзь сабой!», «Я табе дапамагу», «Я ганаруся табой», «Не здавайся», «У цябе атрымалася», «Я ў цябе веру», «Я паважаю тваё рашэнне», «Ты зможаш!», «Ты частка каманды», «Табе ёсць чым ганарыцца»... Навучанне не будзе эфектыўным, калі пазбавіць дзіця нават шанцу на поспех. І зусім іншая справа, калі поспехі прызнаюцца і ацэньваюцца: у гэтым выпадку і да абгрунтаванай і канструктыўнай крытыкі навучэнцы паставяцца хутчэй як да карыснай...




**Мікалай ЗАПРУДСКІ:** *«Я больш як 30 гадоў выкладаў у школе фізіку, больш за 40 гадоў працую ў АПА. І самай цікавай тэмай для мяне заўсёды быў урок. Усё, чым я займаюся ў акадэміі, тakім або іншым чынам звязана менавіта з ім».*

## «НЕ ДАБЯЖЫМ, ДЫК ХОЦЬ САГРЭЕМСЯ»

Здараецца, што на перапынку падыходзяць вучні і цікавяцца ў настаўніка: «А пра што вы будзеце пытаца?» ці «Што будзе ў нас на кантрольнай?»

«Калісьці і мне задавалі такія ж пытанні. І сёння мне сорамна за свае адказы, — прызнаецца Мікалай Запрудскі. — Я казаў дзецям: «Вучыце ўсё!» А ўсё вывучыць проста немагчыма. І калі мы так кажам, то навучэнцам працэй увогуле забыцца пра вучобу. Вось чаму важна ўзброіць вучняў крытэрыямі ацэнкі і растлумачыць ім, чаму мы робім на ўроку тое ці іншае, у той ці іншай паслядоўнасці, чаму задаём менавіта такія дамашнія заданні.

Мікалай Запрудскі канстатуе: часта вучні не ведаюць мэты і не могуць зразумець, што яны робяць на тым ці іншым уроку, а 45 хвілін ужо заканчваюцца. А калі адкрыць дзецям «таямніцу», навошта яны вучацца, давесці да іх мэту ці дапамагчы яе сфармуляваць, то можна зрабіць іх сваімі саюзнікамі.

— Мэта — гэта ўяўленне аб выніках, якіх мы імкнёмся дасягнуць, а не дэкларацыя намераў настаўніка, — падкрэслівае прафесар. — Нікога не трэба пераконваць у тым, што мэта настаўніка і мэта вучня знешне выглядаюць па-рознаму. Але вельмі важна, каб яны ўказвалі на плануемы вынік дзейнасці. Настаўніку трэба «перакласці» мэту на даступную вучню мову. Мэта не можа быць фармальнай! І, канешне, яна павінна быць дасягальнай за 45 хвілін — да моманту, калі празвініць званок. Вельмі ўдалы варыянт — стварэнне праблемнай сітуацыі, калі навучэнцы прыходзяць да высновы, што для яе вырашэння неабходна штосьці ведаць і ўмець. І гэта «штосьці» яны называюць самі. Такім чынам школьнікі самастойна вызначаюць сваю мэту.

Беларускія педагогі вось ужо больш як адзінаццаць гадоў укараняюць на сваіх уроках актыўную ацэнку. (У Еўропе гэта тэхналогія вядомая пад назвай Formative Assessment, або дынамічнае, ці фарміруючае ацэньванне).

Аўстралійскі прафесар Джон Хэці распрацаваў своеасаблівы «барометр», які паказвае ўплыў канкрэтных фактараў на навучанне. Чым вышэйшае значэнне паказчыка, тым большы ўплыў на якасць навучання аказвае гэты момант. Высветлілася, напрыклад, што ў найменшай ступені на якасць уплываюць дамашнія заданні, індывідуалізацыя навучання, колькасць вучняў у класе, падзел на групы па здольнасцях і паўторнае навучанне (пакіданне вучня на другі год). А найбольш высока Джон Хэці ацэньвае існаванне зваротнай сувязі паміж настаўнікам і вучнем (толькі разгорнутая зваротная сувязь істотна карэлюе з высокімі дасягненнямі), ну і, вядома, настаўніцкія чаканні. Педагог павінен верыць, што ўсе дзеці могуць вучыцца і развівацца, што навучальныя вынікі любога з іх могуць змяніцца да лепшага, бо не з'яўляюцца раз і назаўсёды зададзенай велічынёй.

**«У педагога абавязкова павінен заставацца час на асабістае жыццё, на хобі і падарожжы, у процілеглым выпадку ён працуе неэфектыўна».**

Прыхільнікі філасофіі актыўнай ацэнкі выкарыстоўваюць абрэвіятуру «НаШтоБуЗУ» — гэта крытэрыі ацэнкі, інфармацыя для вучняў — «на што настаўнік будзе звяртаць увагу», так бы мовіць, «кантракт» паміж вучнем і педагогам на канкрэтны ўрок.

Калі педагог адразу вызначае крытэрыі поспеху, вучань дакладна ведае, якую работу ён павінен выканаць, якія будуць чаканні настаўніка, а настаўнік не мае праблем з ацэньваннем работы вучня. Бываюць урокі, на якіх дзеці працуюць па прынцыпе «калі не дабяжым, дык хоць сагрэемся» — ці наогул не ведаюць, куды і навошта бегчы. А «НаШтоБуЗУ» — гэта маркеры, каб вызначыць, ці не збіліся са шляху да мэты, з імі і вучань адчувае сябе на ўроку больш упэўнена.

— Тэма ўрока — верш Максіма Багдановіча «Санет» («Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...», — прыводзіць прыклад Мікалай Запрудскі. — НаШтоБуЗУ? На ўменне выразна чытаць верш (з вызначэннем паўз і пастаноўкай націскаў), на веданне відаў лірыкі, на ўменне аналізаваць верш (ведаць тры спосабы стварэння яскравага вобраза крыніцы).

## ПРАВІЛА НЕПАДЫМАННЯ РУКІ

— Не менш важнае мастацтва — уменне працаваць на ўроку з пытаннямі, у прыватнасці ключавымі. Гэта той «кручок», які чапляе ўвагу вучня і не адпускае, пакуль задача не будзе вырашана. Настаўнік павінен быць прыкладам для вучняў у пастаноўцы пытанняў, бо немагчыма стаць паспяховым у жыцці без умення іх задаваць, — падкрэслівае прафесар. — Бізнес таксама пачынаецца з пастаноўкі пытанняў. Трэба ставіць адкрытыя пытанні, без гатовага адказу, яны павінны абуджаць цікавасць, падштурхоўваць да разважанняў, уцягваць і матываваць, ствараць пазнавальную напружанасць на ўроку. І абавязкова трэба даць час на пошук адказаў. Майце на ўвазе, што як толькі хтосьці ў класе падымае руку, усе астатнія тут жа расслабляюцца і перастаюць думаць, таму што выклікаюць таго, хто ўжо ведае адказ. Таму многія з настаўнікаў, якія вучыліся на курсах актыўнай ацэнкі, карыстаюцца правілам непадымання рукі і выклікаюць вучняў да адказаў з дапамогай жэрабя, напрыклад, шляхам выцягвання палосак з прозвішчамі. Правіла непадымання рукі змяншае для вучняў верагоднасць адседзецца, так бы мовіць, у глядзельнай зале, нават калі ідзе работа ў групе.

Ну і самы важны складнік эфектыўнага ўрока, як ужо казалі вышэй, — гэта пісьмовая або вусная зваротная сувязь. Проста сказаць «тут дрэнна, тут дрэнна і тут дрэнна» няправільна. Замест адзнакі ў балах настаўнік каментуе дзейнасць вучня і яе вынікі, што заахвочвае да далейшай работы. Крытэрыяльная (у дапаўненне да бальнай) ацэнка — адзін з асноўных прынцыпаў тэхналогіі актыўнай ацэнкі. «Зваротная сувязь — гэта магчымасць выратаваць і вярнуць у адукацыйны працэс найбольш слабых вучняў, бо дзецям нецікава, калі ў класе адбываецца разбор толькі найбольш тыповых памылак. Кожны хоча чуць найперш пра сябе — пра свае поспехі і няўдачы, — падкрэслівае Мікалай Запрудскі. — Калі выкарыстоўваць зваротную сувязь толькі эпізадычна, то пазітыўнага эфекту чакаць не даводзіцца. А яшчэ трэба распрацаваць стратэгію: дзе мы ставім адзнаку, а дзе забяспечваем вучню зваротную сувязь...»

Добры каментарый павінен быць звязаны з крытэрыямі «НаШтоБуЗУ» і ўключаць чатыры абавязковыя элементы: падкрэсліванне станоўчых бакоў работы вучня, указанне на тое, што павінна быць выпраўлена, над чым трэба працаваць дадаткова, падказкі, як гэта можна зрабіць, і парады, у якім кірунку вучань павінен працаваць далей.

«Эфектыўна навучаць можа толькі эфектыўны настаўнік, — кажа Мікалай Запрудскі. — Мушу канстатаваць, што не кожны педагог здольны паставіць у цэнтр урока вучня з яго патрэбамі. Многім цяжка адмовіцца ад стэрэатыпаў, якія складваліся дзесяцігоддзямі. Для таго каб адбыліся змены ў школе, трэба, каб сам настаўнік пажадаў змяніцца. Таму вучыцеся, чытайце, камунікуйце з калегамі, спрабуйце, заваёўвайце аднадумцаў — і поспех абавязкова прыйдзе».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 9 февраля 2021 года в 11.20 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества**

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 40% бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | асфальто-укладчик S-750, 2003 г.в. | 24600,00 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 2460,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **9 февраля 2021 в 11.20** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121194101193300000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 05.02.2021 г.; время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3»

## Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

### *Вотчын Маларыцкага раёна*

# Калі прыехалі забіраць суседа-інваліда, яна ўзялася стаць апекуном




**Да Кацярыны Бягезы ў Вотчын мы завіталі ў дзень, калі на поўдні Брэстчыны выпаў снег, першы за гэтую зіму. Пасля доўгай шэра-чорнай пары душу парадавалі бялюткія прасторы. А па белым двары гаспадыні бегалі розных узростаў і колераў каты. Катафеі пужліва азіраліся на чужынцаў і хітравата лашчыліся да гаспадыні, маўляў, у місках нічога не засталося, трэба прыбавіць.**

## Шэсць кіламетраў, памножаныя на 16

Кацярына Міленцьеўна шкадуе кожную жывую істоту, вось і пазбіраліся да яе амаль з усёй вёскі вусата-хвастатыя стварэнні. Многія з летніх жыхароў-дачнікаў катоў падкормліваюць, каб весялей было на падворку, а на зіму хаты закрываюць і з'язджаюць у горад. Вось і цягнуцца небаракі да добрай бабулі. Тая корміць іх, дык яны тут, падобна, адчуваюць сябе прывольна.

У некалі, паводле яе вызначэння, «вясёлым і харошым» Вотчыне засталося шэсць пастаянных жыхароў. Летам бывае ўдвая, а то і ўтрая больш, падцягваюцца нашчадкі былых гаспадароў. А зімуюць цяпер — яна, яшчэ адна жанчына ды некалькі нестарых мужчын, як яна гаворыць, хлопчыкаў. Вось і ўсё насельніцтва.

У Вотчын Кацярына выйшла замуж за свайго Сцяпана ў 1962 годзе. Сама яна родам з суседняй украінскай Гуты. Да роднай вёскі напрасткі недзе кіламетраў шэсць. Раней пехатой туды бегала ледзь не кожны тыдзень. Цяпер... падлічылі з Кацярынай Міленцьеўнай, каб ёй дабрацца ў сваю вёску праз афіцыйны пагранічны аўтапераход «Макраны», трэба пераадолець каля сотні кіламетраў толькі ў адзін канец. Калі да пандэміі на Украіну хадзілі цягнікі, было прасцей і бліжэй, можна было па чыгунцы дабрацца ў Забалацце, адтуль да Гуты — кіламетраў дванаццаць. Нядаўна там памерла яе сястра, дык на пахаванне жанчына не папала. Кажа, раней зранку выйшла б з хаты, за гадзіну-паўтары прыйшла б... Такія вось сённяшнія рэаліі жыцця на памежжы.

— Некалі былі вялікія сем'і, не тое, што цяпер, адно ці двое дзяцей у сям'і — разважае Кацярына Міленцьеўна. — Мае бацькі выгадавалі дзевяцярых. У памяці засталося, што весела было, асабліва як у школу хадзілі, усе ўжо велікаватыя, бацькам дапамагалі. Пасля работы на танцы, на вячоркі бегалі, песні спявалі, не заўважалі нават, што жылі бедна. На танцах і сустрэла свайго Сцяпана, які прыходзіў у Гуту з Вотчына.



## Дзеці вайны: раненне ў яе і тэрмін для яго бацькі

А ў вайну перажыць іх сем'ям давялося шмат. Нарадзілася Кацярына Міленцьеўна ў 1942 годзе. Ведае з расказаў маці, як тая з двума малымі ўцякала ад немцаў падчас аблавы, і куля іх усё ж дагнала. Кацярынцы, якой не было і года, куля трапіла ў верхнюю частку пляча, але прайшла навылет, косці не зачапіла, толькі невялічкі след застаўся. А маладую жанчыну з іншымі жыхарамі вёскі пагналі потым у лагер у Забалацце, адтуль набіралі людзей на розныя работы, у тым ліку і для адпраўкі ў Германію. Там маці з двума малымі жыла ледзь не два гады, у лагеры Каця і пачала хадзіць. У Германію не забралі, бо жанчына была з двума дзецьмі на руках. Каб выжыць і накарміць дзяцей, хадзіла на чыгуначную станцыю жабраваць. Нямецкія салдаты-франтавікі кідалі няшчасным жанчынам з вагонаў тушонку, бульбу, кавалкі хлеба, так і карміліся. Часам з лагера вадзілі на работу ў поле і давалі мукі альбо крупы. А жылі ў тым лагеры ў зямлянках з палком. Потым ім дазволілі вярнуцца дадому. Бацьку ў 1944-м забралі на фронт, і амаль адразу ён атрымаў цяжкае раненне, пасля шпіталя вярнуўся дадому.

Але не толькі ад акупантаў цярпелі тутэйшыя людзі. Шмат гора сербанулі і пасля вайны, у навакольных лясах яшчэ доўга хаваліся бандыты, ці, як іх тут называлі, «бульбашы». Іх людзі баяліся, бо тыя прыходзілі звычайна ноччу і бралі ўсё, што ім падабалася з маёмасці, прымушалі дапамагаць, а часам забіралі ў свае атрады маладых мужчын, пагражаючы зброяй. Многія, асабліва актывісты, ад іх рук загінулі. Пацярпеў і бацька яе мужа Сцяпана. «Свёкру загадалі запрэгчы каня і перавезці іх праз роў у лес з амуніцыяй. Вядома, перавёз, а куды дзенешся? У канцы прыгразілі, калі каму раскажа, не пашкадуюць усю сям'ю. А на судзе потым паставілі ў віну, што не данёс, і далі 15 гадоў — расказвае пенсіянерка. — У гэтай вёсцы, можа, з дзясятак мужчын пасадзілі на 10, 15, 25 гадоў. А ў нас, у Гуце, нікога не пасадзілі, хоць дапамагалі аднолькава. Калі ружжо настаўлялі на дзяцей, у гаспадара не заставалася выбару... Адно толькі добра, што 15 гадоў не сядзеў свёкар, потым усё ж была амністыя, і яго выпусцілі», — уздыхае жанчына.

## Калі ў жарце становіцца многа праўды

Са Сцяпанам яны пабудавалі хату, выгадавалі траіх дзяцей. Трыццаць гадоў яна адпрацавала цялятніцай на ферме. Ферма тады была побач, у Вотчыне. «І так выйшла, што сярод жанчын-работніц я была маладзейшая. Мы любілі жартаваць-смяяцца. Бывала, кажу ім: «Ох, я самая маладая з вас, вось вы некалі ўсе паўміраеце, я застануся, усё тут будзе маё». І рагочам далей, а я і не задумвалася нават, што гэта некалі можа стаць праўдай. А цяпер вось нікога з тых ранейшых жывёлаводаў ужо няма, і фермы няма. І школы пачатковай, і магазіна. І ўжо восем гадоў як няма майго Сцяпана. Прыехаў аднойчы праўнук малы да мяне, ідзём з ім па вуліцы. А ён пытае: «А тут хто жыве? А ў гэтай хаце? А ў гэтай?» А я адказваю, што нікога няма, усе паўміралі. А ён дзівіцца: «І чаму ў гэтай вёсцы ўсе людзі паўміралі?» Прыйшлося яму тлумачыць, што старэнькія былі тыя дзядулі і бабулі, цяпер вось толькі хаты іх і засталіся», — гаворыць жанчына.

Але Кацярына Міленцьеўна як была працавітая, так і засталася. У свае 78 гадоў трымае гаспадарку, у хляве ёсць свінні, куры, індыкі. Праўда, летам асноўныя клопаты па гаспадарцы бярэ на сябе гарадскі зяць. У яго такі рэжым работы, што працуе суткі праз трое. І адразу пасля змены кіруе ў вёску. Паводле слоў цешчы, ён дня не можа пражыць без лесу, у грыбы, ягады, проста ў лес ходзіць штодня. І заадно харчовую праграму сям'і выконвае, гадуе розную жыўнасць. А зімой яна ўжо самастойна спраўляецца са значна меншай гаспадаркай. Хоць дзеці ўгаворвалі адмовіцца хаця б ад самай цяжкай часткі работы, напрыклад, збыць свіней. Яна ж пакуль не згаджаецца. Кажа: «Перад Калядамі, як забілі кабанчыка, добра было ўсім у сумкі свежыны накласці». Для яе гэта вялікая радасць, што можа дапамагчы дзецям-унукам з прадуктамі, і не абы-якімі: сваімі, смачнымі, экалагічна чыстымі.

## Суседзі, якім патрэбная дапамога

Акрамя таго, Кацярына Бягеза гатуе есці, штодня дапамагае двайм суседзям. Яны інваліды з дзяцінства, бацькі паўміралі. Мужчынам, старэйшаму з якіх пад пяцьдзясят, патрэбна дапамога. Самастойна яны не могуць весці гаспадарку з прычыны разумовай адсталасці. У жанчыны афіцыйна аформлена апякунства. Яна і дапамагае, есці навaрыць кожны дзень, старэйшы звычайна прыходзіць і забірае. Яшчэ падкажа, як трэба прыбрацца ў хаце, што зрабіць па дамашняй гаспадарцы:

— Яны і паслухаюць, асабліва старэйшы, той усё можа зрабіць, трэба толькі падштурхнуць, пакіраваць.

...У мяне і самой першы хлопчык хворы нарадзіўся, памерла тое дзіцятка, не дажыўшы і да двух гадоў. Я ведаю, што такое хворае дзіця. Колькі часу прайшло, а ўсё свайго ўспамінаю, — з горыччу разважае жанчына. — І гэтых не магу пакінуць. Тут больш няма каму пра іх паклапаціцца. Каб не я, то, мусіць, іх ужо ў прытулкі забралі б, а так яны ў сваёй хаце, дзе выраслі, дзе ўсё прывычнае для іх. Я пенсію іхнюю атрымаю і ўсё распісваю: большая частка на прадукты ў аўтакраме, гэтая частка — нешта купіць з тавараў, а гэта — адкласці на паліва. Вось і нядаўна заказала прычэп дроў, прывезлі гатовых, паколатых. А прапаліць печ яны самі здолеюць.

Старшыня Хаціслаўскага сельскага Савета Аляксандр Карабейка, з якім мы наведалі вёску, расказаў потым пра спробу аформіць малодшага з інвалідаў у сацыяльную ўстанову. У яго стан здароўя горшы, таму і было прынята такое рашэнне. А калі дакументы падрыхтавалі і прыехалі за ім з раёна, камісія застала ў хаце ўсіх у слязах. Плакаў, бо не хацеў ад'язджаць, малодшы, плакаў яго старэйшы брат, плакала, на гэта гледзячы, і Кацярына Міленцьеўна. А потым сказала: «Пакуль змагу, буду памагаць хлопцам». І яго не забралі. Пажылая апякунка спраўляецца, а адчуванне неабходнасці іншым людзям, здаецца, надае ёй сілы.

Яна ўсіх шкадуе, усім спачувае. Расказала яшчэ пра аднаго суседа, з якім, на яе думку, несправядліва абышоўся лёс. Жыццё не склалася як трэба, бо своечасова не знайшоў сабе пару, так і пражыў бабылём. Працаваў зваршчыкам, таму датэрмінова выйшаў на пенсію, а па ўзросце яшчэ і не пенсіянер. І што здзіўляе ў яго суседку, ідэальны парадак у хаце: бялізна вымытая, падлога памытая, хоць і ў чарку чалавек зазірае — галоўным чынам, відаць, з-за суму. Адным словам, патэнцыйны гаспадар прападае.

## Майстрыха на ўсе рукі

Затое ў яе зусім няма часу сумаваць. Пра гаспадарку і штодзённае гатаванне ежы для падапечных ужо гаварылася. У выхадныя Кацярына Міленцьеўна спявае ў царкоўным хоры, а ў царкоўнай бібліятэцы бярэ кнігі, каб чытаць вечарамі. Выпісвае газету, каб быць у курсе навін, глядзіць тэлевізар. Раней вышывала, цяпер гэтае хобі пакінула, бо зрок аслаб. Ручнікі на абразах, падушкі, абрусы — усё вышыта яе рукамі. І нават ходнікі, дыван на падлозе — не проста тканыя, а вышываныя. Апошняе нячаста даводзілася бачыць, гэта, хутчэй, украінская традыцыя, якую Кацярына прынесла з сабой у беларускую вёску.

А яшчэ яна каравайніца, якіх не так многа ў акрузе. Раней часта пякла пірагі, вясельныя караваі, цяпер гэта па зразумелых прычынах здараецца рэдка. Муж старэйшай унучкі працуе аператарам на Брэсцкай студыі тэлебачання. Аднойчы, як здымалі сюжэт пра маларыцкіх каравайніц і майстрых, завіталі і да бабулі Кацярыны. Яна свой каравай пякла, можна сказаць, на камеру. Вядома, сюжэт быў пазней размешчаны ў інтэрнэце. Дык расказвалі, што водгукі прыйшлі не толькі з розных куткоў нашай краіны, але нават з Германіі.

Дзеці Кацярыны Бягезы жывуць недалёка, сын і дачка — у Брэсце, яшчэ адна дачка — у Маларыцкім раёне. Бабуля мае ўжо сем унукаў і шэсць праўнукаў. Усе любяць прыязджаць у Вотчын летам. Калі будзе нагода сабрацца ўсёй вялікай сям'ёй, то яна сваіх фірменных пірагоў абавязкова напячэ.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**


**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 8 февраля 2021 года в 12.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества**

| Сведения о предмете аукциона (лот № 2) | Начальная цена продажи со снижением на 70 %, бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| административно-бытовой корпус площадью 142,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежности: ограждение железобетонное и деревянное, покрытие асфальтобетонное | 38 704,16 | Могилевская область, Бобруйский р-н, Химовский с/с, д. Слобода | 3 870,00 |
| Склад площадью 263,0 кв. м | | | |
| Весовая площадью 7,0 кв. м с входящими в составные части и принадлежностями – теневой навес | | | |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 23-64-24, 28-41-00.

2. Общая стоимость имущества 38704,16 бел. руб. без НДС.

3. Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках, находящихся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3» с кадастровым номером 720884806101000001.

4. Дата, время и место проведения аукциона: **08.02.2021 в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **05.02.2021 г.; время: 17.00**. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10% от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

9. Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

10. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г.

11. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже вышеназванного имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» и на сайте ОАО «ДСТ № 3»

# Лазовыя кошыкі зноў у трэндзе

## Іх 85-гадовы майстар з Гродзенскага раёна прызвычаіўся плесці адной рукой



**Мар'ян ДАГІЛЬ з аграгарадка Індура ў спісах народных майстроў не пазначаны. Ён сам па сабе. Затое ў вёсцы і наваколлі яго добра ведаюць. Нярэдка Мар'яна Пятровіча можна ўбачыць каля аўтобуснага прыпынку, куды ён выносіць на продаж свой тавар. Прадае танна. Зарабіць асабліва не імкнецца, больш спадзяецца, што яго майстэрствам хто-небудзь зацікавіцца і ён зможа перадаць свае навыкі маладзейшым.**

Знаёмства з простым вяскоўцам і яго жонкай Марыяй Пятроўнай аказалася надзвычай цёплае. Вельмі прыязныя людзі: чужога чалавека сустракаюць так, нібыта роднага ці добра знаёмага. Падумалася, што такія адносіны вельмі часта можна сустрэць у вёсках. Гараджане гэту асаблівасць даўно страцілі, а вяскоўцы, збольшага сталыя, так і жывуць з адкрытымі сэрцам і душой. Вось і Дагілі такія.

І з домам не памылілася. Толькі дзверы адчыніла, а тут, у сенцах, — лаза да столі і кошыкаў з дзесятак побач стаіць. Яшчэ зусім свежыя, нават крыху вільготныя. Адсюль, можна сказаць, і пачалося маё знаёмства з тэхналогіяй пляцення тых самых кошыкаў, якія калісьці былі ў кожнай вясковай хаце. З дзяцінства памятаю іх на нашым двары. А вось адкуль яны браліся — так да гэтага часу не ведала. Таму з цікавасцю слухала майстра, які данёс гэтае рамяство да сённяшняга часу. І ў свае 85 гадоў не спыняе работу. Больш за тое, спраўляецца толькі адной рукой, пры гэтым адзін кошык можа зрабіць усяго за тры гадзіны.

— Я прывык. Найперш гну «каблук», такую аснову. Тут трохі трымаю левым плячом, а правай рукой — пайшоў круціць, — раскрывае сваю тэхналогію Мар'ян Пятровіч. — У мяне пытаюцца: як ты даеш рады адной рукой плесці? Я кажу: мне Бог дапамагае...

Бяда напаткала яго больш за тры дзясяткі гадоў таму. У той дзень, па словах жонкі, сусед папрасіў дровы папіліць. Муж нёс працоўную бензапілу, спатыкнуўся і ўпаў на яе. У выніку страціў левую руку. Спачатку вельмі нерваваўся, кажа Марыя Пятроўна. Але да характару мужа яна ўжо прызвычаілася, бо ведаюць адно аднаго яшчэ з дзяцінства — жылі ў суседніх вёсках. А разам ужо больш за 60 гадоў. Ці то няшчасце падштурхнула, ці яшчэ што, але ў мужа абудзілася даўняе захапленне. Гэта значна палепшыла яго душэўны стан. Да таго ж кошыкі прыйшліся даспадобы і вяскоўцам, і дачнікам.

— Гэта чырвоная лаза, яна мацнейшая за зялёную. Зразаю каля балота, тут не так далёка, потым цягну на ровары дамоў. Калі суха, яна не такая гнуткая, таму трэба выразаць у вільготнае надвор'е, бо лаза любіць ваду. Яна як высахне, ламаецца, а так — гнецца, кошыкі будуць вельмі моцныя, — тлумачыць Мар'ян Пятровіч.

А вось гатовы кошык ужо можна і падсушыць. Гэты працэс адбываецца на гарышчы, куды адпраўляецца кожная новая партыя. І ўжо вясной, калі яны там вылежацца, можна лічыць, што кошыкі дайшлі да патрэбнай кандыцыі.

Тэхналогію пляцення спадар Мар'ян асвоіў яшчэ ў дзяцінстве, калі з дзедам пасвіў кароў. Менавіта ад яго і пераняў рамяство. Дзед казаў: прыглядайся, можа, спатрэбіцца. Вось і ўспомніў Мар'ян Дагіль гэтую навуку, калі здарылася няшчасце. Стаў спрабаваць. Адзін, другі кошык зрабіў, але ўбачыў, што нешта не тое. Пачаў даходзіць сваім розумам. Спраўляўся адной рукой не горш, чым дзвюма. Нават адмовіўся ад пратэза. Набыў і свой почырк. Кошыкі ў яго атрымліваюцца круглыя, трывалыя. Кажа, што так прасцей бульбу ў мяшок высыпаць. Тэхналогію сваю Мар'ян Пятровіч не змяняе і іншых формаў не шукае. Ведае, што



можна з дроту плесці ці з лёскі, але застаецца верны свайму кірунку — лазоваму. Тым больш што такіх майстроў вельмі мала. Ды і ахвотных навучыцца рамяству — адзінкі.

— Адзін з-пад Гродна прыехаў, хацеў навучыцца. Я пагадзіўся, няхай прыязджае, навучу. Мне будзе весялей. Тут жа не трэба пяць гадоў вучыцца, варта паглядзець, а потым і самому можна дабіцца, як лепш зрабіць. І праўда, у яго стала добра атрымлівацца. Але, на жаль, яго ўжо няма. Унукі таксама не цягнуцца да майго занятку, — кажа майстар.

Чаго толькі не перадумае Мар'ян Пятровіч, калі пляце кошык... Здаецца, усё жыццё перад вачыма праходзіць. Цяжкія пасляваенныя гады, калі ў калгасе за дзень зараблялі сто грамаў збожжа, і нешчаслівы лёс траіх дзяцей, якія заўчасна пайшлі з жыцця, і ўласны не вельмі ўдалы лёс... Але ўсё ж вясковец стараецца скіраваць свае думкі на пазітыў.

— Сяду і памалу кручу, успамінаю жыццё. Хачу, каб кошык атрымаўся ўдалы, каб людзям спадабаўся... І вы сабе выберыце які-небудзь, хай застанецца падарунак на памяць, — прапанаваў майстар.

А чаго тут выбіраць? Усе кошыкі адзін да аднаго. Цяпер, гледзячы на гэты цудоўны выраб, заўсёды ўспамінаю майстра. Думаю, я не адна такая ўдзячная. Мясцовыя жыхары і прыезджыя добра ведаюць унікальнага ўмельца. Бо не кожны здолее плесці такія кошыкі нават і дзвюма рукамі. Часам майстар выносіць па некалькі штук на продаж да аўтастанцыі.

— Я ўжо крычу: не трэба, хапае нам пенсіі, — падтрымала размову жонка. — Але не дзеля заробку, а больш нейкі занятак. Летась сто штук зрабіў. За цэлую вясну прадаў. Нядорага, па дзесяць рублёў. На гарышчы яшчэ паўсотні сохне, а тут свежыя, за два дні сплёў.

Магчыма, цяпер у сучаснай гаспадарцы такія кошыкі не надта ўжываюцца. Многія карыстаюцца пластыкавымі ёмістасцямі. Між тым дзе-нідзе, але трапіцца на вочы і прыдатны лазовы кошык. Навейшыя ў асноўным выконваюць дэкаратыўную ролю, упрыгожваюць аграсядзібы і двары. Зараз модна высаджваць у кошык кветкі, насыпаўшы на плёнку грунт.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

### ❍ У ТЭМУ

Як наогул ідуць справы з лозапляценнем? З такім пытаннем звярнулася да **вядучага метадыста па народных промыслах Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Яніны БАРЫСЕВІЧ.**

— Сітуацыя з лозапляценнем апошнім часам пагоршылася, — адзначала суразмоўца. — Хоць быў час, калі ў Гродзенскім рэгіёне гэты промысел быў вельмі папулярны. У 1990-х гадах у Гродне нават была фабрыка лазовай мэблі, і не толькі ў абласным цэнтры. Але ў 2000-х вытворчасць не здолела канкураваць з традыцыйнай мэбляй, і яе закрылі. Многія майстры знайшлі сабе іншы занятак.

Сам промысел, вядома, не знік. Некаторыя майстры, бывае, выносяць на кірмашы свае кошыкі. Асабліва папулярны ў гродзенскіх рамеснікаў вясновы кірмаш «Казюкі». Сюды прыходзіць са сваімі невялікімі, але адметнымі кошыкамі майстар Антон Кісель. Яшчэ Яніна Барысевіч згадала некалькі жанчын-майстрых, якія ўваходзяць у суполку майстроў «Гарадзенскі каларыт». Ёсць сям'я Піваварчыкаў, дзе займаюцца лозапляценнем муж і жонка, яны ўносяць новыя аўтарскія здабыткі ў традыцыйны промысел. Па словах Яніны Барысевіч, сёння зноў расце попыт на звычайныя сялянскія кошыкі, на кірмашах многія шукаюць менавіта іх і хутка раскупляюць. Цяпер яны ўпрыгожваюць і дачы, і сядзібы. І найбольш папулярныя — рабрыстыя кошыкі з неапрацаванай лазы зялёнага і бардовага колераў. Кажуць, што на Гродзеншчыне больш за сто відаў такой лазы. Між тым працэс нарыхтоўкі, апрацоўкі з выпраўленнем у кіпені ствараe пэўныя складанасці ў навучанні, напрыклад у гуртках ці на майстар-класах.


**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Дворецкий»**

Предмет торгов – Лот:
1) Капитальное строение с инв. № 150/С-22068 (наименование: цех плодоовощной консервный, инв. № а154; назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака), площадью 790,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Г, 0,3 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000080, площадью 0,2139 га.
Составные части и принадлежности: ограждение территории инв. № 57, колодец инв. № 69, наружный водопровод инв. № 464.
2) Капитальное строение с инв. № 150/С-22057 (наименование: мастерская инв. № 005; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 78,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/8, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
3) Капитальное строение с инв. № 150/С-22058 (наименование: напорная канализация, инв. № 313; назначение: здание специализированное коммунального хозяйства), площадью 20,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/9, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
4) Капитальное строение с инв. № 150/С-22060 (наименование: котельная инв. № 012; назначение: здание специализированное коммунального хозяйства), площадью 1243,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/6, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
Составные части и принадлежности: ограждение территории, инв. № 57, противопожарный резервуар, инв. № 35, дымовая труба, инв № 47, емкость РВС-400, инв. № 172, емкость РВС-400, инв. № 173, емкость РВС-400, инв. № 174, канализационный отстойник, инв. № 316, самотечная канализация, инв. № 311, наружный водопровод, инв. № 30, артскважина, инв. № 32, башня водонапорная, инв. № 33;
5) Капитальное строение с инв. № 150/С-22062 (наименование: склад материальный, инв. № 019; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 1007,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/5, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
6) Капитальное строение с инв. № 150/С-22063 (наименование: ремонтная мастерская инв. № 090; назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), площадью 1095,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/4, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
Составные части и принадлежности: ограждение с/х машин, инв. № 55, ограждение ГСМ, инв. № 54

7) Капитальное строение с инв. № 150/С-22064 (наименование: лукохранилище инв. № 003; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 802,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/1, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
8) Капитальное строение с инв. № 150/С-22065 (наименование: корпус бытовой инв. № 008; назначение: здание административно-хозяйственное), площадью 818,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
Составные части и принадлежности: автодорога, инв. № 60;
9) Капитальное строение с инв. № 150/С-22067 (наименование: мазутонасосная инв. №94; назначение: здание специализированное коммунального хозяйства), площадью 64,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/7, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
Составные части и принадлежности: резервуар мазута, инв. №40, резервуар мазута, инв. № 39, резервуар мазута, инв. № 38, резервуар стальной, инв. № 175, резервуар стальной, инв. № 176, резервуар стальной, инв. № 177, автомазутослив, инв. № 95;
10) Капитальное строение с инв. № 150/С-22069 (наименование: гаражи, инв. № 016; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 1014,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/3, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
11) Капитальное строение с инв. № 150/С-22070 (наименование: проходная мех. двора, инв. № 018; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 46,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/2, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
12) Капитальное строение с инв. № 150/С-22071 (наименование: прачечная, инв. № 344; назначение: здание специализированное для бытового обслуживания населения), площадью 67,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Б/10, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000081, площадью 19,3425 га.
13) Капитальное строение с инв. № 150/С-22145 (наименование: административное здание инв. № 009; назначение: здание административно-хозяйственное), площадью 563,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000082, площадью 0,7639 га

14) Капитальное строение с инв. № 150/С-22061 (наименование: магазин, инв. № 45; назначение: здание специализированное розничной торговли), площадью 71,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4/2, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000082, площадью 0,7639 га.
Составные части и принадлежности: ограждение;
15) Капитальное строение с инв. № 150/С-22066 (наименование: домик овощевода, инв. № 319; назначение: здание специализированное растениеводства), площадью 78,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4/1, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000082, площадью 0,7639 га.
16) Капитальное строение с инв. № 150/С-22059 (наименование: автоматическая насосная станция, инв. №314; назначение: здание специализированное коммунального хозяйства), площадью 10,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4Е, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кад. № 124781700001000083, площадью 0,0407 га

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 729688,24 | Размер задатка, руб. | 72 968,82 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Дворецкий», 225652, Брестская обл., Лунинецкий р-н, аг. Дворец, ул. Школьная, 3, тел. 80164795232. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 код BPSBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает также вознаграждение Организатору аукциона

**Аукцион состоится 9 февраля 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 8 февраля 2021 г. до 17.00**

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Дворецкий» было опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2020

# Дапамога — ёсць!



«Мы не маем права даваць ацэнку каму-небудзь. Наша мэта — аказваць дапамогу», — адзначаюць валанцёры.

## АБАГРЭЦЬ І НАКАРМІЦЬ

Пункты абагравання, пра якія актыўна пісалі СМІ на гэтым тыдні, — не новая для валанцёраў Беларускага Чырвонага Крыжа форма работы. Ярка-чырвоныя палаткі, дзе можна сагрэцца, выпіць гарбаты і проста адпачыць, яны ставяць у самыя марозныя дні ва ўсіх рэгіёнах краіны ўжо сёмую зіму.

— Гэта звыклая форма дапамогі, проста раней пра гэта неяк не згадвалі ў прэсе, — кажа Віталь. — Нічога экстраардынарнага. У маразы — адны правераныя, эфектыўныя меры, на паводку, дапусцім, — іншыя. Мы не ратавальнікі, не займаемся непасрэднай ліквідацыяй надзвычайных сітуацый. Але ў любой НС ёсць наступствы, прамыя і адтэрмінаваныя. І вось якраз наступствы, звязаныя з парушэннем нармальных умоў жыцця — гэта наша сфера адказнасці.

Меры рэагавання на нізкую тэмпературу залежаць ад паказанняў тэрмометра. Пры мінус 15 Беларускі Чырвоны Крыж аказвае гуманітарную дапамогу найбольш уразлівым слаям насельніцтва, а па месцах збору асоб без пэўнага месца жыхарства адпраўляюцца мабільныя атрады валанцёраў з коўдрамі і кансервамі. Цэнтры абагравання разгортваюцца пры мінус 20—25. Пункты абагравання дзейнічаюць таксама на базе раённых арганізацый Беларускага Чырвонага Крыжа — людзям забяспечваюць першую дапамогу пры абмаражэннях, гарачыя напоі, прадуктовыя і гігіенічныя наборы.

— Мы атрымліваем прагноз надвор'я, і калі бачым, што чакаецца ўзмацненне маразоў, загадзя мабілізуем валанцёраў, — тлумачыць Віталь.

Колькі пунктаў абагравання выстаўляецца ў кожным канкрэтным выпадку, залежыць ад патрэб насельніцтва.

— Арыентуемся на даныя сацыяльных службаў у кожным рэгіёне — перш за ўсё на звесткі аб асобах без пэўнага месца жыхарства, — расказвае суразмоўнік. — Але сагрэцца, выпіць гарбаты ці кавы ў такіх пунктах можа любы прахожы (у палатцы цёпла і чыста, напоі разліваюць у аднаразовы посуд). Або, напрыклад, кіроўца, у якога ў маразы заглохла машына. Беларуская зіма непрадказальная, наперадзе яшчэ люты — і зараз мы прапрацоўваем на будучыню пытанне аб пунктах абагравання для кіроўцаў на трасах.

## САГРЭЎСЯ — І СЫШОЎ

У Мінску, расказваюць валанцёры, вялікага ажыятажу ў бяздомных пункт абагравання не выклікаў (валанцёры ўсталявалі яго на Ваўпшасава, 42, недалёка ад дома начнога знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства). А вось у Гродне і Гомелі такія цэнтры былі вельмі запатрабаванымі. У Гродне яны працавалі кругласутачна, і ў іх бяздомныя маглі нават перананачаваць. Вельмі патрэбнымі былі цэнтры абагравання і ў маленькіх населеных пунктах. У буйных гарадах у людзей усё ж больш магчымасцяў сагрэцца ў маразы.

— А ў сталіцы бяздомныя проста забіралі прадуктовыя і гігіенічныя наборы і часта адмаўляліся нават ад гарачай гарбаты. Адпраўляліся па сваіх справах.

***— А якія ў іх справы?***

— Забеспячэнне сваёй жыццядзейнасці. Для кагосьці гэта банальна бутэлька, хтосьці спрабуе падпрацоўваць, ёсць і тыя, хто сапраўды хоча выбрацца з той ямы, у якой апынуўся.

Прадуктовы і гігіенічны наборы, які можна было атрымаць, — гэта дзве вялікія скрынкі. У адной — мясныя і рыбныя кансервы, чай, макарона, у другой — туалетная папера, аднаразовыя маскі, флакон дэзінфекцыі для рук, сурвэткі, мыла, зубная паста.

— Коўдры і цёплыя шкарпэткі мы зберагалі для рэйдаў па месцах знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства, — гаворыць Віталь Дэмбоўскі. — Зразумела, што ўсіх мы не знойдзем і не сагрэем, але многіх нашы патрулі знаходзілі.

У Мінску, кажа Віталь, такія месцы ёсць нават у цэнтры — напрыклад, за кінатэатрам «Масква». Там валанцёры знайшлі аднаго са сваіх «кліентаў»: ён чакаў, пакуль мінуць маразы, на кардонках на цеплатрасе і спрабаваў падпрацоўваць грузчыкам у навакольных крамах.

— У яго, прынамсі, ёсць дакументы, і ў прынцыпе ён нават досыць прыстойна апрануты па мерках бяздомных, — кажа Віталь. — Расказаў нам, што да пандэміі ездзіў на заробкі ў Расію. У кожнага з іх — свая сумная гісторыя...

***— Ці рэальна такім людзям вярнуцца да нармальнага жыцця?***

— У прынцыпе гэта магчыма. Зразумела, што на сённяшні дзень ніхто не забяспечыць гэтым людзям усіх умоў для вяртання ў соцыум, але некаторыя механізмы ўсё ж такі ёсць. Валанцёры і супрацоўнікі дома начнога знаходжання на Ваўпшасава, 42 падаюць запыт на аднаўленне дакументаў, дапамагаюць з працаўладкаваннем, забяспечваюць дахам над галавой: там можна не толькі начаваць, а менавіта жыць, калі чалавек сапраўды хоча вярнуцца да нармальнага жыцця — не піць, знайсці работу, аднавіць дакументы. Але, на жаль, у большасці гэтых людзей праблемы з алкаголем, і многіх менавіта гэта загнала ў той тупік, у якім яны знаходзяцца.

Далёка не ўсе «насельнікі» гэтага «паралельнага сусвету», які звычайныя гараджане не заўважаюць, падобныя паміж сабой. Не ва ўсіх «дом згарэў, самі мы не мясцовыя», гаворыць суразмоўнік. У некаторых на самай справе ёсць нават кватэра, і з юрыдычнага пункту гледжання такія людзі не бяздомныя — проста яны выбіраюць такі лад жыцця. Для некаторых з іх бадзяжніцтва — не неабходнасць, а, можна сказаць, жыццёвая філасофія.

***— Як да такіх людзей ставяцца валанцёры?***

— А як да іх ставіцца? Людзі ж. Згодна з прынцыпам дзейнасці Беларускага Чырвонага Крыжа, мы не маем права і не ставім сваёй задачай даваць ацэнку каму-небудзь або чаму-небудзь. Наша мэта — перш за ўсё аказваць дапамогу ў рамках сваёй кампетэнцыі, матэрыяльную і псіхасацыяльную падтрымку, каб захаваць жыццё і здароўе людзей. Іншы раз з чалавекам трэба проста пагаварыць — і яму стане лягчэй, з'явяцца сілы нешта мяняць у сваім жыцці. Зразумела, што гэта разавая псіхалагічная дапамога. Але нават разавая ўсё ж лепш, чым ніякай. Тым больш, некаторыя ўвогуле не ведаюць, што існуе Беларускі Чырвоны Крыж, што валанцёры могуць дапамагчы. Большасць бяздомных знаходзіцца па-за інфармацыйнай прасторай, у іх ёсць толькі «сарафаннае радыё». Дапамогу гэтыя людзі прымаюць па-рознаму. Большасць — з удзячнасцю.



Людзі, у якіх няма даху над галавой, у першую чаргу маюць патрэбу ў падтрымцы.

## ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР

У прынцыпе трапіць у валанцёры Беларускага Чырвонага Крыжа нескладана — дастаткова запоўніць форму на сайце redcross.by, указаўшы свае навыкі і прафесійныя кампетэнцыі, тое, чым ты можаш быць карысны і чым хацеў бы займацца.

— Спісачная частка валанцёраў — тых, хто гатовы дапамагаць людзям, — у нас вялікая. Але калі казаць пра людзей, якія працуюць, напрыклад, у тых жа пунктах абагравання, у іншых надзвычайных сітуацыях — гэта валанцёры, якія валодаюць пэўнымі ведамі і навыкамі. Там, дзе патрабуецца кваліфікацыя, мы не задзейнічаем «спісачную частку», а бярам людзей са складу вопытных валанцёраў, якія прайшлі падрыхтоўку, — кажа Віталь. — Навучанне, дарэчы, можа цалкам бясплатна прайсці любы ахвотны. Валанцёраў вучаць аказваць першую дапамогу, як медыцынскую, так і псіхалагічную, правільна будаваць камунікацыю з рознымі людзьмі, самім хутка спраўляцца са стрэсам. Плюс абавязковая страхоўка жыцця і здароўя: пры ўзнікненні НС такіх людзей мы задзейнічаем максімальна хутка. Праходзяць нашы валанцёры і падрыхтоўку для работы са спецыялізаваным абсталяваннем — механізаваным інструментам, бензагенератарамі і г. д.: у такіх людзях мы павінны быць упэўненыя на ўсе сто.

Таму, нягледзячы на тысячы, якія ёсць у базе, кожны падрыхтаваны валанцёр — на вагу золата. Але не трэба думаць, што па-сапраўднаму карысныя ў Беларускім Чырвоным Крыжы могуць быць толькі мужчыны з вопытам службы ў МНС за плячыма. Напрыклад, «залаты фонд» валанцёрскага руху — гэта неабыякавыя людзі пенсійнага ўзросту.

— Мы прымаем у валанцёры людзей з 18 гадоў і не абмяжоўваем верхнюю планку ўзросту. Зразумела, што ў сілу ўзроставых асаблівасцяў пенсіянеры не змогуць цягаць цяжкую апаратуру. Затое яны валодаюць мудрасцю, цярплівасцю, стойкасцю. Яны ведаюць, якія словы патрэбныя чалавеку ў цяжкай сітуацыі. А акрамя таго, за доўгія гады амаль усе яны сталі высакакласнымі прафесіяналамі ў тым, чым займаліся ўсё жыццё. Адзін з кірункаў работы Беларускага Чырвонага Крыжа — дапамога людзям з інваліднасцю або пажылым, якія праз узрост страцілі фізічныя магчымасці. Працэй кажучы, валанцёры і іх падапечныя проста ходзяць адзін да аднаго ў госці. І адначасна валанцёры аказваюць ім дапамогу — медыцынскую, гуманітарную, сацыяльную, псіхалагічную. Асабліва важныя для гэтай місіі медыцынскія работнікі на пенсіі — яны становяцца ўдзельнікамі медыкасацыяльнай службы «Дапамога».

## ПАТРЭБЫ І МАГЧЫМАСЦІ

— На жаль, калі казаць пра сталіцу і рэгіёны, дапамога не ўсюды роўная, — кажа Віталь Дэмбоўскі. — Часам усё ўпіраецца ў рэсурсы. Калі б мы былі арганізацыяй, якая забяспечваецца сістэмна і мае гарантаваны бюджэт, можна было б размяркоўваць яго пароўну — з улікам патрэб у кожным рэгіёне. Вядома, мы да гэтага імкнёмся — стварыць стратэгічныя запасы, напрыклад, на выпадак маразоў. Але Беларускі Чырвоны Крыж — гуманітарная арганізацыя, і мы маем толькі тыя рэсурсы, якія нам хтосьці ахвяраваў, людзі або арганізацыі. І загадзя ні пераліку, ні колькасці спрагназаваць не можам. Напрыклад, калі казаць аб той жа цёплай вопратцы для маламаёмных, у Мінску яе звычайна збіраецца нашмат больш, чым у абласцях. І калі ёсць празмернасць, мы адпраўляем вопратку ў іншыя рэгіёны, дзе адчуваецца недахоп.

Неаднолькавы і валанцёрскі рэсурс: тых, хто хоча дапамагчы, у вялікіх гарадах больш, проста таму што там жыве больш людзей. І грашовых сродкаў — наяўных і безнаяўных — у сталіцы і абласных цэнтрах Беларускаму Чырвонаму Крыжу ахвяруюць больш, чым у рэгіёнах.

— Бываюць мэтавыя ахвярадаўцы, якія хочуць адправіць свае сродкі менавіта на дапамогу, напрыклад, людзям з анкалогіяй, або хворым дзецям, або на іншыя кірункі нашай работы. Многія ахвяруюць проста на дзейнасць Беларускага Чырвонага Крыжа. Зразумела, мы не можам зрабіць справаздачу кожнаму чалавеку, куды пайшла ахвяраваная ім невялікая сума (за вашы грошы мы купілі плед або тэрмас). Але мы можам сказаць, на які кірунак дзейнасці былі накіраваныя вашы грошы і што за сабраныя на гэтую місію сродкі было зроблена.

Часам гэта выклікае неразуменне ахвярадаўцаў, і апошнім часам Беларускі Чырвоны Крыж перайшоў на формы фандрайзінгу, дзе наогул няма фінансавага складніка.

— Усюды, дзе фігуруюць нейкія фінансы, мы стараемся не акумуляваць іх ні ў руках, ні на рахунках. Беларускі Чырвоны Крыж — гэта пасярэднік, які злучае маючых патрэбу з тымі, хто дае. Нам не важна, якім чынам людзі атрымаюць дапамогу — мы гуманітарная ўстанова і не хочам забіраць сабе нейкія лаўры. Наша місія — актывізаваць гуманітарны патэнцыял грамадства і накіраваць яго ў патрэбнае рэчышча.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ЯК АХВЯРАВАЦЬ НА ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ЧЫРВОНАГА КРЫЖА

- Адзенне і прадметы побыту можна прынесці ў любую раённую арганізацыю Беларускага Чырвонага Крыжа або ў пункты прыёму ў вашым населеным пункце.
- На партале redcross.by размешчана інфармацыя аб кірунках работы арганізацыі ў Беларусі, а таксама спіс тых, каму можна дапамагчы.
- Беларускі Чырвоны Крыж прадстаўлены ва ўсіх сацсетках і месенджарах. Дастаткова пакінуць паведамленне, і з вамі звяжуцца валанцёры.

Здарэнне

# Самападпал у цэнтры Мінска

**Ранкам у пятніцу каля аднаго з будынкаў па сталічнай вуліцы Савецкай мужчына абліў сябе вадкасцю з бутэлькі і падпаліў. Яго неўзабаве патушыў супрацоўнік праваахоўных органаў, дапамогу аказаў і выпадковы мінак, паведамілі ў Следчым камітэце. Мужчына, у якога дыягнаставана больш за 50 % апёкаў паверхні скуры, шпіталізаваны ў Рэспубліканскі апёкавы цэнтр у непрытомным стане.**

У ведамстве таксама праінфармавалі пра асобу пацярпелага.

— Самападпал здзейсніў 35-гадовы мінчанін. Раней ён неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку за дробнае хуліганства, з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане ап'янення, кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання, і да крымінальнай — за незаконны абарот наркотыкаў, — адзначылі ў Следчым камітэце.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Гэта трэба бачыць

# Беларускі пейзаж як феномен:

## пазнай мясціны дзяцінства

**Мы прызвычаіліся да таго, што музеі сучаснага мастацтва выводзяць нас з зоны камфорту: яны дэманструюць незразумелае і нязвыклае. Але новая выстаўка Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў у нейкім сэнсе разбурае стэрэатыпы. У ім прадстаўлены работы беларускіх мастакоў — пейзажы, выкананыя ў рэчышчы акадэмічнага жывапісу.**



Цікава, што, трапіўшы на выстаўку, кожны з гледачоў заўважыць нешта блізкае яму. Намаляваныя маладыя дрэўцы нібы такія ж, як ва ўласнай вёсцы, рачулка — ці не тая, каля якой бавіўся з вудай... Спрацоўваюць архетыпы, і на ўзроўні калектыўнага несвядомага мы раптам «пазнаём» знаёмыя з дзяцінства мясціны.

Мастакі, работы якіх увайшлі ў экспазіцыю «Сучасны беларускі пейзаж», нарадзіліся і пачалі сваю прафесійную адукацыю ў Мінску, Магілёве і Гомелі. Яны працягваюць традыцыі рускага акадэмізму, але надаюць сваім карцінам уласна беларускі, тутэйшы каларыт.



**Міхаіл МІРОШНІКАЎ, куратар выстаўкі,** распавядае:

— Наш лірычны пейзаж у маладым выкананні — гэта такі ж від мастацтва, як і іншыя кірункі, напрыклад, беларускі канцэптуалізм, сімвалізм або абстракцыянізм. На нашай тэрыторыі лірычны пейзаж — гэта складнік беларускай школы. Перш за ўсё гэтаму вучаць у гомельскіх, магілёўскіх і мінскіх установах адукацыі. Напрыклад, Гомельскае мастацкае вучылішча заўсёды было апірышчам пейзажу. Мастакі-ўдзельнікі выстаўкі — найбольш яскравыя прадстаўнікі розных кірункаў у стылістыцы падачы лірычнага пейзажу. Васіля Пешкуна пазнаюць ужо даўно па яркіх жывапісных палотнах, да яго падцягваюцца астатнія: Антон Вырва, Міхаіл Крот. Работы стваралiся на пленэрах, яны дыхаюць жывымі ўражаннямі.

Куратар экспазіцыі падкрэсліў, што для беларускага менталітэту характэрная ўстойлівасць звычак і традыцый, у тым ліку і ў мастацтве. Таму такія кірункі, як кніжная станковая графіка і той жа самы пейзаж, выдатна адчуваюць сябе да гэтага часу. Міхаіл Мірошнікаў лічыць, што яны і складаюць той самы феномен беларускай школы.

Трапіць на выстаўку можна будзе да 28 лютага.

**Арына КАРПОВІЧ.**

У лабірынтах мастацтва

# Мастак, лэдзі і хоспіс. Мар'ян Богуш-Шышка

**Мінулы, 2020 год, ЮНЕСКА аб'явіла годам мастака Рушчыца, першага дэкана Віленскага ўніверсітэта імя Стафана Баторыя, які належаў культуры чатырох краін — Беларусі, Расіі, Літвы і Польшчы. Да 26 студзеня 2021 года ў Мастацкім музеі праходзіць выстаўка «Фердынанд Рушчыц. Да 150-годдзя з дня нараджэння». Адно з адкрыццяў выстаўкі — імя яго вучня, Мар'яна Богуша-Шышкі, ураджэнца Астравеччыны.**

Равеснік ХХ стагоддзя, ён памёр у Лондане ў 94 гады, пражыўшы амаль век, таму англійскі крытык Ньютан назваў яго «мастаком стагоддзя». Мар'яна Богуша-Шышку адкрыў для беларусаў Адам Мальдзіс, які паруліўся, каб на радзіму трапіла некалькі твораў гэтага незычайнага мастака, каб быў зроблены куток яго творчасці на яго радзіме ў Трокеніках пад Астраўцом. Зараз у родным доме Богуша — сельская бібліятэка-клуб. Там захоўваюцца жывапіс і некалькі шаўкаграфій з карцін творцы, якія падарыла яго ўдава лэдзі Цэцылія Саўндэрс у 1996 годзе.

Рушчыц часта згадваў Богуша-Шышку ў сваім дзённіку і ўспрымаў яго хутчэй не вучнем, а асістэнтам, памочнікам, калегам. Яны былі роўняй па паходжанні: Мар'ян багаты беларускі шляхціц (па матчынай лініі паходзіў з арыстакратычнага роду Козел-Паклеўскіх) з родавай сядзібай у Трокеніках пад Вільняй, з адпаведным выхаваннем — французскай гувернанткай і ўрокамі верхавой язды, паездкамі за мяжу. Ён вучыўся ў Рушчыца два гады і быў пасланы на стажыроўку ў Кракаўскую акадэмію мастацтваў. Богуш скончыў Кракаўскую акадэмію ў майстэрні Ёзэфа Мехофера, меў навуковую ступень па матэматыцы, напісаў чатыры кнігі па гісторыі мастацтва, у тым ліку і пра Леанарда да Вінчы, і што для нас вельмі важна — не перакладзеную да гэтага часу кнігу пра мастацтва Вялікага Княства Літоўскага.

Богуш-Шышка, прыязджаючы на радзіму з Кракава, перадаваў Рушчыцу-дэкану пасылкі і нават узнагароды ад кракаўскіх калег. Менавіта ён у 1924 годзе адважыўся задаць настаўніку пытанне, якое мучыла многіх яго вучняў: чаму той пакінуў жывапіс у 40 гадоў і ці вернецца да яго пасля? І Рушчыц адказаў метафарычна, у сваёй манеры, запісаўшы адказ у дзённіку: «Гэта як пацеркі на ружанцы: яны розныя, але нітка адна». У 1939 годзе Богуш-Шышка павінен быў, на думку Рушчыца, прыняць кіраўніцтва кафедрай жывапісу ва ўніверсітэце імя Стафана Баторыя, але пачалася вайна.

«Мастак з моцным характарам» — назвала яго неяк крытыка. У 1927—1929 гадах жыў у Кобрыне на Палессі, дзе быў настаўнікам малявання. Ён адчуваў гэта як «культурную місію»: навучаць сельскіх дзяцей мастацтву. «Але калі прыехаў і пабачыў, як дзеці малююць, пераканаўся, што не я буду іх вучыць маляваць, а яны мяне», — успамінаў ён. Ад дзіцячай непасрэднасці і наіўнасці ён шмат чаго перанёс у сваю творчасць. А малюнкі палескіх дзяцей паказаў праз пяць гадоў на выстаўцы ў Варшаве ў Польскім інстытуце прапаганды. Гэта філасофія рушчыцавай школы: «мастацтва павінна быць усюды». Наступныя 10 гадоў Богуш пражыў у Гдыні. Да 1939 года меў 19 выставак — у Гдыні, Гданьску, Кракаве, Любліне, Чанстахове і Варшаве. Ён пішa вытанчаныя партрэты, малафарматныя імпрэсіяністычныя пейзажы, у якіх натура патанае ў сонцы.

У 1939 годзе мастак добраахвотнікам пайшоў у армію, ваяваў у марской пяхоце і трапіў у палон да фашыстаў, прабыў у лагеры для інтэрніраваных ваеннапалонных чатыры з паловай гады. Яму было дазволена чытаць лекцыі па



матэматыцы і весці студыю. Пасля вызвалення саюзнікамі ў 1945 годзе ўступіў у другі польскі корпус арміі Андэрса — часткі арміі Вялікабрытаніі, якая пасля заканчэння вайны дыслацыравалася ў Італіі. Яго дзядзька, вялікі чын у арміі Андэрса, пахадайнічаў, каб ён трапіў у мастацкі аддзел, які быў прызваны арганізоўваць вольны час афіцэраў — экскурсіі ў музеі, паездкі па памятных мясцінах. Шышка таксама арганізаваў мастацкую школу пад Рымам для былых мастакоў і ўсіх ахвотных. Год, праведзены ў Італіі, Богуш-Шышка лічыў роўным заканчэнню пяці акадэмій. Затым войска было пераведзена ў Англію, і мастак стаў эмігрантам. У Кракаве засталася любімая сям'я, якую ён падтрымліваў матэрыяльна. Пасля дэмабілізацыі ў 1947 годзе трэба было шукаць работу ў Англіі.

Рушчыц у апошнія гады жыцця лічыў сваёй місіяй педагагічную дзейнасць, выхаванне мастакоў — патрыётаў свайго краю. Богуш-Шышка стаў яго верным пераемнікам: у Лондане заснаваў Акадэмічнае таварыства ўніверсітэта імя Стафана Баторыя са студыяй станковага жывапісу па праграме Віленскага ўніверсітэта. Богуш быў актыўны і пладавіты мастак, выстаўляўся ў Лондане і Парыжы. Ён працаваў у розных тэхніках — жывапісу, акварэлі, гуашы і малюнка, з якіх друкаваліся яго вытанчаныя эстампы-шаўкаграфіі.

На адкрыцці сваёй выстаўкі ў Лондане ў 1963 годзе майстар пазнаёміўся з англійскай арыстакраткай, баранесай лэдзі Цэцыліяй Саўндэрс, якая была апанаваная марай стварэння шпіталя паліятыўнай дапамогі — хоспіса ў імя святога пакутніка Хрыстафора.



Яна падтрымала мастака купляй карцін для капліцы хоспіса. Адна з іх — «Святы Хрыстафор»: захоўваецца ў Лондане, графічны адбітак з яе — у Трокеніках.

У гэтым творы адчуваецца, што Богушу вядомыя шматлікія драўляныя народныя скульптуры ў касцёлах радзімы. Чалавечыя сілуэты тут ненатуральна выцягнутыя і моцна стылізаваныя. Ён маляваў пастозна, грубавата і наносіў фарбу доўгімі мазкамі пэндзля.

Паступова сустрэчы і дзелавыя адносіны лэдзі і мастака перараслі ў любоўныя, якія доўжыліся некалькі гадоў. Верны шлюбнай клятве, Богуш ажаніўся з лэдзі Саўндэрс толькі пасля пяці гадоў жалобы па нябожчыцы-жонцы. Баранесе быў 61 год, яму 80.

Пара пражыла душа ў душу больш за 15 гадоў. Увесь гэты час майстар жыў і працаваў у хоспісе, стаўшы, як ён выказаўся, «мастаком па месцы жыхарства». Заканчэнне жыцця ў хоспісе, у прыгожым садзе яго жонка трактавала як час роздуму, спакою і адпачынку, пошуку сэнсу існавання. «Прыгажосць — найлепшы сродак, які загойвае боль», — лічыла яна. У хоспісе былі тэатр, мастацкая студыя, праходзілі канцэрты вядомых музыкаў. Богуш стаў яе верным паплечнікам: пісаў карціны на евангельскія тэмы, арганізаваў і там мастацкую студыю, дзе выкладаў пацыентам жывапіс — выдатны сродак арт-тэрапіі. Мастак тады канчаткова парваў з рэалізмам на карысць сінтэтычнай і сімвалічнай формы выказвання, стаў экспрэсіяністам.



Незвычайнае яго жывапіснае палатно «Цуд у Кане» (1960), упершыню выстаўленае ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь на выстаўцы, прысвечанай 150-годдзю Рушчыца. Гэта падарунак музею ад удавы мастака. Карціна напісана па знакамітым сюжэце першага з 35 цудаў Ісуса Хрыста — ператварэння вады ў віно на вяселлі ў Кане Галілейскай. Гэта прыхаваная алегорыя: падобна таму, як вада ўтойвала віно, Хрыстос быў схаваны ад свету на працягу шасці біблейскіх стагоддзяў. Віно, якое ў Богуша нагадвае кроў, ліецца ў збаны магутным патокам. Творы Богуша-Шышкі з хрысталагічнага цыкла далёкія ад прымірэння і рэлігійнай сузіральнасці: яны дынамічныя, рэзкія і трывожныя, часам нават драпежныя і агрэсіўныя.

Карціны Богуша паступова напаўнялі палаты хоспіса. З часам гэта «мясціна міласэрнай смерці» ператварылася ў незвычайны манаграфічны музей Богуша-Шышкі. Адзін з вядомых яго твораў «Птушка» — гэта і душа, якая ўзнімаецца ўверх па залатых аблоках, і Святы Дух, і голуб міру — парафраза з вялікага Пікаса.

Цяпер у хоспісе святога Хрыстафора каля 60 карцін Богуша-Шышкі. Ён навучыўся быць побач з тымі, хто памірае, іх блізкімі, і падтрымліваць іх, захоўваючы асабістую раўнавагу. Ён разумеў, што неўзабаве і сам апынецца на месцы сваіх вучняў. Памёр у хоспісе, у якім жыў апошнія некалькі дзесяцігоддзяў, акружаны клопатам сясцёр міласэрнасці і сваёй жонкі. Яго атачалі яго карціны.

**Надзея УСАВА,**
**вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.**

Рэаліі часу

# КУЛЬТУРА Ў ЭПОХУ ПАНДЭМІІ:

## творцам неабходна яшчэ пераасэнсаваць гэты няпросты перыяд

**Галоўны рэдактар «Медицинского вестника» паэтка Тацццяна СІВЕЦ перакладае в'етнамскую паэзію і раіць ратавацца ад дэпрэсіі чытаннем. Сёння, калі медыкі ў цэнтры ўвагі грамадства, да выданняў, адрасаваных ім, патрабаванні асаблівыя. Адно з іх — газету «Медицинский вестник» — узначальвае вядомая паэтэса, драматург, перакладчыца, старшыня Міжнароднага фонду Янкі Купалы Тацццяна Сівец. Сутычча медыцыны і літаратуры — добрая пляцоўка, каб пагаварыць аб варунках, у якіх сёння існуе культура. Падставай для размовы стала і тое, што нядаўна інтэрнэт-праект «Здаровыя людзі» рэдакцыі газеты «Медицинский вестник» зрабіўся лаўрэатам прэміі «Залатая Ліцера».**



sb.by

— Гэта ўзнагарода — заслуга высокапрафесійных журналістаў, якія працуюць над парталам, і яго кіраўніка — практыкуючага ўрача-анестэзіёлага-рэаніматолага, дацэнта кафедры анестэзіялогіі і рэанімацыі БелМАПА, кіраўніка ўсіх нашых інтэрнэт-праектаў і медыцынскага эксперта «Медвестника» Вольгі Святліцкай, — тлумачыць Тацццяна Сівец. — Дзякуючы яе працы ўсе нашы матэрыялы адрозніваюцца высокай экспертнасцю, многія патрапляюць у топ-Google і «Яндэкс», на партал «Здаровыя людзі» спасылаюцца многія інтэрнэт-крыніцы як у Беларусі, так і за яе межамі.

***— Вы — паэтка, якая ўзялася курыраваць прафесійнае медыцынскае выданне... Зрэшты, і сярод медыкаў было нямала тых, хто сцвердзіўся ў літаратуры.***

— Я расла ў сям'і ўрача, таму для мяне было натуральным, пакуль тата не прыйшоў з работы, хуценька разгарнуць газету «Медицинский вестник», якую мы выпісвалі, здаецца, ад пачатку яе заснавання ў 1991 годзе, і адшукаць штосьці цікавае для сябе. І знаходзіла ж! Бо, нягледзячы на тое, што «МВ» — адзіная ў нашай краіне прафесійная газета для медработнікаў, — шырокая аўдыторыя вымагае і багацця тэм. Увогуле я захапляюся нашымі дактарамі. Гэта людзі, якія вучацца не шэсць гадоў — яны ўсё жыццё імкнуцца штодня атрымліваць новыя веды... А калі згадаць пра ўрачоў-труэнтаў (асобы, якія адначасова з медыцынай сталі вядомыя не толькі ў літаратуры, як вы кажаце, але і ў палітыцы, эканоміцы, выяўленчым мастацтве і г. д.) — гэта ўвогуле ўнікальная з'ява. Яна прымушае задумацца пра тое, што людзі, якія працуюць у медыцыне, маюць мысленне настолькі развітое, што здольныя рабіць адкрыцці ў галіне прыродазнаўчых навук, як Карл Лінэй, займацца астраноміяй, як Капернік, або мовазнаўствам, як Уладзімір Даль... І пры гэтым у многіх знаходзіцца час на хобі (мы і пра тых, хто займаецца конным спортам, пісалі, і пра матацыклістаў, пра спевакоў ды аматараў вышыўкі — ёсць у нас адпаведная рубрыка «Хобі і Ты»). Ды і на ўласную творчасць ці, прынамсі, на тое, каб пачытаць штосьці з мастацкай літаратуры, сіл хапае. Гэта без сумнення — эліта нацыі, асобы, здольныя прымаць жыццёва важныя рашэнні, несці за іх адказнасць...

***— Моцна змянілася ваша работа з надыходам пандэміі?***

— Пра каранавірус «Медвестник» пачаў пісаць яшчэ ў студзені 2020-га, калі ў нас не было нават першага пацыента. Мы на працягу года шукалі найлепшых экспертаў па ўсіх медыцынскіх спецыяльнасцях, перакладалі замежныя даследаванні, слухалі міжнародныя вэбінары — такім чынам, сёння «Медвестник» — і газета, і партал — гэта без перабольшання самы поўны агрэгатар праверанай прафесійнай інфармацыі пра COVID-19. І вось хочацца без залішняга пафасу абысціся, але ж ад медработнікаў сапраўды залежыць наша жыццё, будучыня... І сёння мы адчуваем гэта, як ніколі раней. Дарэчы, зараз нам дасылаюць шмат вершаў, прысвечаных барацьбе дактароў Беларусі з каранавіруснай інфекцыяй, яны ствараюцца пацыентамі і часам не маюць вялікай мастацкай вартасці, але гавораць пра галоўнае — павага да медработнікаў у грамадстве пачала ўзрастаць.

***— А яна некалі падала?..***

— Насамрэч можна казаць пра пэўны крызіс даверу, які характэрны для сістэм аховы здароўя па ўсім свеце. Да слова, апошнія некалькі месяцаў на старонках «Медвестника» мы расказваем, на чым грунтуецца ахова здароўя ў розных краінах: Кітаі, ЗША, Італіі, Швецыі, Ізраілі. Якія падыходы трэба ўзяць на ўзбраенне, а чаго імкнуцца пазбегнуць. Але згаданы крызіс тлумачыцца тым, што сёння свет медыцыны сутыкнуўся з новай з'явай — інфармаваны, або Е-пацыент — той, хто перад візітам у медустанову звяртаецца да «Доктара Гугла» і ставіць пад сумненне тое, што раіць спецыяліст... Да таго ж пашыраецца сетка медыцынскіх паслуг, і пацыент прывыкае, што за яго грошы ўрач абавязаны лячыць, пры гэтым часцяком здымае з сябе адказнасць за ўласнае здароўе! Помню, з якой павагай, нават піетэтам, мая бабуля казала пра свайго доктара з райцэнтра, яго словы было законам, яго паважалі як носьбіта звышведаў, звышінтэлекту. Да ўрача звярталіся па медыцынскую дапамогу. А калі гэтае паняцце ў свядомасці людзей пачало падмяняцца аказаннем «медпаслуг», дык і стаўленне пачало трансфармавацца — як да тых, хто гэтыя паслугі аказвае.

***— Нават на фронце былі выязныя канцэртныя брыгады... А для тых, хто працуе з вірусная навалай, ёсць нейкія бонусы з боку культурных работнікаў?***

—Уяўляю дэсант паэтаў у рэспіратарах і сродках індывідуальнай аховы!.. Калі сур'ёзна, дык найлепшая дапамога для медыкаў зараз — гэта берагчы сябе і сваіх блізкіх. Нават у новым роліку, створаным нашай відэа-студыяй «МВ-Медыя», доктар дзякуе тым, хто носіць маскі. Яшчэ ў першую хвалю наша супрацоўніца вечарамі шыла касцюмы і маскі для медработнікаў. Кожны з нас павінен зразумець: самае лепшае, што можна зараз зрабіць для дактароў — не захварэць, не павялічваць аб'ём і так вельмі няпростай іх працы... А каб праявіць творчыя здольнасці, мы прапанавалі ўсім беларусам паўдзельнічаць у нашым конкурсе дызайнерскіх масак.

***— І колькі было аматараў «масачнага крэатыву»?***

— 158! І ўсе маскі — непаўторныя. Нам дасылалі фота сваіх масак і дзеці, і дарослыя, і настаўнікі, і дактары... Галоўнае — усе яны пісалі, што разумеюць, як важна насіць маску ў грамадскіх месцах. А 60-гадовая ўдзельніца прызналася, што зрабіла ўласнаруч ужо больш за сто масак і падарыла іх дактарам сваёй паліклінікі. Прыемна, што пандэмія, замест таго каб раз'ядноўваць, неверагодным чынам аб'ядноўвае людзей!

***— Усе прадказваюць, што пандэмія адлюструецца ў творах... Ці праўда, што экстрэмальныя абставіны даюць натхненне, альбо наадварот?***

— Відаць, «пандэмічная літаратура» акурат зараз і ствараецца... Бо творцам неабходна асэнсаваць гэты няпросты час, пражыць яго. У экстрэмальных абставінах выбіраецца галоўнае: тое, што застанецца. Мы часта марнуем час на будзённыя клопаты, мяркуючы: «заўтра напішу». Дык вось менавіта каранавірус даказаў, што самае важнае трэба рабіць, пісаць, праяўляць — тут і цяпер.



medvestnik.by

Пераможца творчага конкурсу «COVID, маска... Новы год!»

***— А як з тваёй перакладчыцкай дзейнасцю?***

— Апошнім часам я перакладала з англійскай творы в'етнамскіх паэтак — Нгуен Фан Кве Май і Нгуен Тхі Туі Лінь. У іх вельмі своеасаблівы паэтычны голас і адметнае адчуванне свету. Немагчыма апісаць эмоцыі, якія перажываеш разам з імі. Напрыклад, у творы «Верш, які я дасюль не магу назваць», Нгуен Фан Кве Май распавядае пра дзядулю і бабулю, якія загінулі падчас галаду ў 1945 годзе разам з двума мільёнамі іншых в'етнамцаў, калі Японія і Францыя акупіравалі В'етнам. І ў гэтых радках — гісторыя не толькі роду, але і Народа.

*Рукі мае трымаюць талерку з рысам.*
*Рыс гэты вырас з зямлі, дзе ляжыць*
*дзядуля.*
*Кожнае зерне салодкае ад калыханак,*
*што бабуля спявала мая. Бабуля,*
*якой не помню.*
*Я ўяўляю маршчыны на твары яе,*
*старую яе сукенку,*
*скуру, што кожную костачку абцягнула;*
*у галодным тым 45-м годзе,*
*маёй вёсцы могілак не хапала.*
*Дзе пахавалі бабулю, не знаў мой бацька,*
*шэсцьдзясят пяць гадоў яму рыс быў горкі.*
*Пасля доўгіх гадоў шуканняў прывіды продкаў*
*шлях да месца яе спачыну нам падказалі,*
*«Мама», —*
*тады ўпершыню пачула я*
*гэтае слова з вуснаў сівога бацькі.*

* * *

*Ураслі мае ногі ў глебу, калі адчула,*
*як душа яе пяйднала зямлю і неба,*
*як прарасла душа і ўзнялася рысам,*
*рысам, якому спявала яна калыханку.*
*Вось таму і па сёння ў кожным рысавым зерні*
*бачу я продкаў, салёны іх пот і слёзы,*
*чую заўсёды ціхую калыханку,*
*што спявала бабуля... Бабуля, якой не помню...*

***— У самаізаляцыі людзі пачалі яшчэ больш часу праводзіць за камп'ютарамі. Праз маніторы камунікуюцца сябры, праводзяць нарады, чытаюць лекцыі, глядзяць спектаклі... Пра нормы бяспечнага карыстання, здаецца, даўно забыліся...***

— Тут варта звярнуцца да партала «Здаровыя людзі», дзе ёсць артыкулы пра тое, як змагацца з сіндромам сухога вока, а таксама, як правільна арганізаваць рабочае месца на «аддалёных» і нават як заканчацца і захаваць пачуццё на адлегласці. Працытую параду эксперта: *«Пастарайцеся, каб работа за камп'ютарам не перавышала сумарна 8 гадзін у дзень. Пры гэтым не забывайцеся рабіць перапынкі. Для прафілактыкі павышанай стамлянасці вачэй, развіцця сухасці слізістай карыстайцеся правілам «20-20-20». Гэта значыць: кожныя 20 хвілін работы за камп'ютарам неабходна рабіць перапынкі і на 20 секундаў факусаваць зрок на прадметах, якія знаходзяцца на адлегласці 20 футаў (6 метраў). Гэта трэба для таго, каб пераключыць позірк, зняць напружанне з вачэй, паміргаць. Праз кожныя гадзіну-паўтары нядрэнна выдзеліць час для 5-хвіліннай зрокавай гімнастыкі».*

***— Эпоха дыстанцыявання — выпрабаванне для псіхікі... Адзінота — нармальны стан для творчага чалавека?***

— На маю думку, пісьменніку заўжды трэба «дыстанцыравацца», нават знаходзячыся ў цэнтры падзей, бо яго мера адказнасці за кожнае слова — большая, чым у іншых. У гісторыі былі прыклады, калі творцы мянялі «пяро на штык», але ці варта гэта было па вялікім гістарычным рахунку? Часцей за ўсё ад гэтага страчвала літаратура. Зрэшты, і маўчанне Купалы гаварыла многім больш за словы...

***— Як ратавацца ад дэпрэсіі сродкамі культуры?***

— Я раю — чытаць, глядзець, слухаць... Тое, што прыносіць пазітыўныя эмоцыі. Няхай і анлайн, але нельга адкладваць жыццё на пасля — чакаць, калі скончыцца пандэмія. Жыццё памянялася. Трэба гэта прыняць і выкарыстоўваць усе магчымасці, якія нам прапануюць высокія тэхналогіі. А калі ўжо наведваць нейкія культурныя мерапрыемствы, то рабіць гэта трэба з выкананнем усіх эпідэміялагічных патрабаванняў: трымацца на адлегласці не менш як 1,5 метра, насіць ахоўныя маскі, мыць рукі або апрацоўваць іх антысептыкам... Ну, а больш падрабязна пра ўсё гэта — на партале і YouTube-канале «Здаровыя людзі»!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Вынікі і планы

# ТРЭНДЫ КНІЖНАГА РЫНКУ

**Міжнародная кніжная выстаўка, якая кожны год праходзіць у Мінску, дапамагае зразумець, што цікава сучаснаму чытачу, якія трэнды існуюць на кніжным рынку. Але адной выстаўкі недастаткова, каб паглыбіцца ў тэму кніжнага бізнесу і дасканала зразумець усе яго працэсы. Таму перад асноўным мерапрыемствам адбываецца шэраг іншых: так, 20 студзеня прайшла прэс-канферэнцыя выдавецтва «Народная асвета».**

Асноўная мэта сустрэчы — падвядзенне вынікаў і знаёмства з кніжнымі навінкамі. Каманда выдавецтва прадставіла і сваіх аўтараў. Сярод іх — Уладзімір Вавула, у «Народнай асвеце» выйшла яго кніга «Вайна. Юнацтва. Подзвіг», ёй карыстаюцца вучні беларускіх школ пры падрыхтоўцы навуковых работ. А Святлана Быкава, старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, з вялікім захапленнем прадэманстравала творчы праект — зборнік «Карані», у які ўвайшлі вершы і апавяданні беларускіх літаратараў. Выдавецтва не пазбягае і вострых тэм, напрыклад, экалагічных праблем.

А што чакае чытачоў на самой выстаўцы? **Вікторыя КАЛІСТРАТАВА, дырэктар выдавецтва,** падзялілася планамі:

— Мы прэзентуем серыю кніг «Казкі для вундэркіндаў». Таксама, паводле гэтай серыі, правядзем гульню для дапытлівых «Жадаю ўсё ведаць». Акрамя таго, падчас мерапрыемства «падключым» тэлефон даверу: можна будзе ананімна падзяліцца сваімі псіхалагічнымі праблемамі і атрымаць параду.

Нагадаем, што «Народная асвета» была арганізавана ў 1951 годзе. Доўгі час выдавецтва было лідарам у выданні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для школ. Сёлета «Народная асвета» не толькі працягвае абраны кірунак, але і развіваецца далей. Сярод незвычайных праектаў — распрацоўка падручнікаў для дзяцей з парушэннямі зрокавага і слыхавога ўспрымання.

**Арына КАРПОВІЧ.**

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – 8 февраля 2021 года в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена.

К отчуждению предлагается имущество битумной базы ДСУ № 14 ОАО «ДСТ № 3», расположенное по адресу: г. Могилев, по проспекту Шмидта (район ТЭЦ-2):

- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72270, наименование – здание склада, общей площадью 314,1 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное блочное здание склада с мощением, забором;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72164, наименование – битумохранилище №1, общей площадью 446,6 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное крупнопанельное здание битумохранилища № 1 с насосной и эстакадой;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72300, наименование – здание битумохранилище № 2, общей площадью 454,8 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное кирпичное здание битумохранилище № 2 с насосной;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72268, наименование – битумохранилище № 3, общей площадью 372,9 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное крупнопанельное здание битумохранилище № 3 с насосной, эстакадой;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72271, наименование – здание склада, общей площадью 63,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное железобетонное здание склада;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72274, наименование – здание склада, общей площадью 63,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное железобетонное здание склада;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-72272, наименование – здание склада, общей площадью 63,0 кв. м с входящими составными частями и принадлежностями: одноэтажное железобетонное здание склада;
- капитальное строение с инвентарным номером 700/С-108638, наименование – подъездной железнодорожный путь, протяженностью 131,0 м с входящими составными частями и принадлежностями: сооружение «Подъездной железнодорожный путь»;

иное имущество:

- емкость 15 м$^3$ с инв. № 2573;
- емкость 4,5 м$^3$ с инв. № 2947;
- емкость 10 м$^3$ с инв. № 2948;
- емкость 60 м$^3$ с инв. № 2949;
- емкость 28 м$^3$ с инв. № 2978;
- емкость 60 м$^3$ (подземная) с инв. № 2980;
- емкость 60 м$^3$ с инв. № 612;
- цистерна железнодорожная с инв. № 909;
- цистерна железнодорожная с инв. № 910;
- подстанция КТП 859250 вкт с инв. № 2878;
- система охранной сигнализации с инв. № 3202;
- таль электрическая канатная ТЭ200-52120 с инв. № 2644;
- вагон-общежитие с инв. № 2408;
- сеть электроснабжения с инв. № 4045, протяженностью 165,3 м.

Общая стоимость имущества **218 114, 74** (двести восемнадцать тысяч сто четырнадцать рублей 74 копейки) бел. руб. с НДС.

Информация о земельном участке.

Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках, находящихся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3» с кадастровыми номерами 740100000005004090, 740100000005004074, 740100000005005532.

Дата, время и место проведения аукциона: **08.02.2021 в 15.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **05.02.2021 г.; время: 17.00.** При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB301211924101 19330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Сроки подписания договора купли-продажи имущества. Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г.

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже вышеназванного имущества ОАО «ДСТ № 3» опубликованы в газете «Звязда» и на сайте ОАО «ДСТ № 3»

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **26 февраля 2021 г.** в 14.00, г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов | г. Мядель, ул.17 Сентября, д. 7, каб. 17, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел.: (801797) 40735, 22352.<br>С момента опубликования извещения до 16.00 24 февраля 2021 г.<br>В рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Порядок осмотра земельных участков на местности | В рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| Условия проведения аукциона | Наличие не менее двух участников |
| Продавец | Мядельский сельский исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Мядельский сельский исполнительный комитет:<br>**г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, тел.: (801797) 40735, 22352** |
| Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе | Размер задатка: 10 % от начальной цены.<br>Документы: заверенная банком копия платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации.<br>Реквизиты: р/с BY54AKBB36410619001106100000 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код AKBBBY21601, УНН 600380436, код платежа – 04901 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношения создания земельного участка и публикацией извещений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне |
| **ЛОТ № 1** | |
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома (код – 1 09 04, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Центральная, участок №1 площадью 0,25 га (кадастровый номер 624083103601000197).<br>**Начальная цена 38 000 (тридцать восемь тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) – озеро Нарочь на площади 0,25 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Имеется возможность подключения электроэнергии.<br>Имеется возможность центрального газоснабжения.<br>Центральные водоснабжение, водоотведение в населенном пункте отсутствуют. |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 140 руб. 76 к., в том числе:<br>публикация извещения о проведении аукциона – 140 руб. 76 к. |
| Дополнительно | В соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» возмещение затрат не требуется |
| **ЛОТ № 2** | |
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код – 1 09 04, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Центральная, участок без номера площадью 0,2023 га (кадастровый номер 624083103601000275).<br>**Начальная цена 28 000 (двадцать восемь тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) – озеро Мястро на площади 0,2023 га и в охранных зонах линий связи и радиофикации на площади 0,0037 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Асфальтированный подъезд.<br>Имеется возможность подключения электроэнергии.<br>Имеется возможность центрального газоснабжения.<br>Центральные водоснабжение, водоотведение в населенном пункте отсутствуют |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 2 143 руб. 48 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 1080 руб. 83 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 784 руб. 69 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 137 руб. 20 к.<br>публикация извещения о проведении аукциона – 140 руб. 76 к. |
| Дополнительно | О возмещении затрат в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» – возмещение не требуется |
| **ЛОТ № 3** | |
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (код – 1 09 04, земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Азарки-Дворище, площадью 0,2258 га (кадастровый номер 624083100101000051).<br>**Начальная цена 8 000 (восемь тысяч) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5 % от предыдущей цены |
| Ограничения в использовании земельного участка | Ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,0060 га и в охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения на площади 0,0062 га |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Асфальтированный подъезд.<br>Имеется возможность подключения электроэнергии.<br>Имеется возможность центрального газоснабжения.<br>Центральные водоснабжение, водоотведение в населенном пункте отсутствуют |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 1 838 руб. 39 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 803 руб. 27 к.<br>оформление градостроительного паспорта – 840 руб. 36 к.<br>государственная регистрация земельного участка – 54 руб .00 к.<br>публикация извещения о проведении аукциона – 140 руб. 76 к. |
| Дополнительно | О возмещении затрат в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» – возмещение не требуется |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельской дистанции гражданских сооружений РУП «Гомельскоеотделение Белорусской железной дороги» (продавец) извещает о проведении 9 февраля 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел.руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-137584**, **площадью 115,9 кв. м**, назначение – торговое помещение, наименование – **магазин.** Охранно-пожарная сигнализация (инв. № 047177).<br>**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Хозяйственная, 1-2 | **41 252,77** | 4 125,28 |

**Продавец:** Гомельская дистанция гражданских сооружений РУП «Гомельское отделение Белорусской железой дороги», г. Гомель, ул. Хозяйственная, 19. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 95-43-92 – начальник ПТО Миненков Андрей Васильевич; 8 (0232) 95-43-55- инженер ПТО Седая Валентина Ивановна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельская дистанция гражданских сооружений РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»):** р/с BY20 BPSB 3012 1116 2501 3933 0000 в Региональной дирекции №300 ОАО «БПС-Сбербанк» по Гомельской области, БИК BPSBBY2X, УНП 400082376, ОКПО 010636523013, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот №1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 января 2021 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов) заканчивается 5 февраля 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части); Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.11.2020 г. № 229 (29343). Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА». Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 9 февраля 2021 года в 11.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи бел. руб., без НДС | Место нахождения имущества | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот № 5 | здание мобильное «М-К1-3», тип ТС – прицеп, 2000 г. в. | 1020,00 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156 | 102,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **9 февраля 2021 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121194010119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 05.02.2021 г.; время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размешены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3»

# ПЕКІН ДАМОВІЎСЯ З БРУСЕЛЕМ

## Чым адметнае глабальнае пагадненне паміж Паднябеснай і Еўрасаюзам?

**За чарадой навагодніх і калядных свят амаль незаўважанай засталася насамрэч знакавая падзея, якая несумненна акажа сур'ёзны ўплыў на сусветны геапалітычны расклад. У канцы снежня на відэасамітце кіраўнікоў дзяржаў ЕС і Кітая старшыня КНР Сі Цзіньпін, канцлер ФРГ Ангела Меркель, прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон, а таксама старшыня Еўрапейскага савета Шарль Мішэль і старшыня Еўрапейскай камісіі Урсула фон дэр Ляен завяршылі перагаворы па ўсеабдымнай інвестыцыйнай дамове (EU—China Comprehensive Agreement on Investment). Гэтыя няпростыя перагаворы распачаліся яшчэ ў 2013-м, цягам сямі гадоў было праведзена 35 раўндаў, але бакі ўсё ж здолелі прыйсці да кансэнсусу. Варта адзначыць, што летась у красавіку ЕС і Кітай узялі на сябе абавязацельства завяршыць перамовы да канца года і здолелі яго выканаць, нягледзячы на драматычныя ўмовы пандэміі каранавіруса. Чым адметнае глабальнае пагадненне паміж Паднябеснай і Еўрасаюзам?**

### Перавагі і асцярогі

Пра завяршэнне складаных перагавораў па гістарычнай дамове паведаміла старшыня Еўракамісіі (ЕК) Урсула фон дэр Ляен на сваёй старонцы ў «Твітэры». «ЕС мае самы вялікі адзіны рынак у свеце. Мы адкрытыя для бізнесу, але мы адданыя ўзаемнасці, роўным умовам гульні і каштоўнасцям», — напісала яна ў сваім твіце, дадаўшы, што пагадненне прывядзе да «больш збалансаванага гандлю і дзелавых магчымасцяў». Як лічыць Урсула фон дэр Ляен, пагадненне ўмацуе два найбуйнейшыя эканамічныя блокі ў галіне гандлю і інвестыцый».

«Гэта будзе самае амбіцыйнае пагадненне, якое Кітай калі-небудзь заключаў з трэцімі краінамі», — падкрэслена ў афіцыйным паведамленні Еўракамісіі. ЕК сцвярджае, што дасягнутыя дамоўленасці дазваляюць Еўрасаюзу захаваць «прастору для палітычных рашэнняў», асабліва ў энергетыцы, сельскай гаспадарцы і сферах інфраструктуры і дзяржаўных паслуг.

Цяпер здзелку павінны ўхваліць усе лідары ЕС, а затым неабходная ратыфікацыя Еўрапейскім парламентам. Падрабязнасці пагаднення пакуль невядомыя, аднак у Еўрасаюзе дагэтуль няма кансэнсусу аб яго мэтазгоднасці. Далёка не ўсіх членаў садружнасці задавальняе пагадненне. Напрыклад, Польшча адзначыла той факт, што Еўрасаюз заключыў здзелку, не чакаючы інаўгурацыі абранага прэзідэнта ЗША Джо Байдэна, чыя каманда ўжо выказала занепакоенасць намерамі садружнасці. «Нам трэба больш кансультацый і празрыстасці, каб прыцягнуць нашых трансатлантычных саюзнікаў. Добрая, збалансаваная здзелка лепш, чым заўчасная», — адзначыў кіраўнік МЗС Польшчы Збігнеў Рау ў сваім «Твітэры». Джэйк Саліван, якога Байдэн прапанаваў на пасаду дарадцы па нацбяспецы, падчас перамоў Брусселя і Пекіна заклікаў да «больш хуткіх кансультацый з нашымі еўрапейскімі партнёрамі».

Рэзкая крытыка зыходзіць таксама з боку Еўрапейскага парламента. Грынхард Буцікофер, кіраўнік парламенцкай дэлегацыі па адносінах з Кітаем, таксама закрануў тэму ўзаемаадносін Бруселя і Вашынгтона і пераходу ўлады ў ЗША. «Растлумачце, чаму тры тыдні таму ЕС, які любіць называць сябе сцяганосцам шматбаковасці, заявіў, што хоча каардынаваць свае дзеянні з адміністрацыяй Байдэна ў дачыненні да Кітая, а цяпер ён спрабуе падштурхнуць гэтую здзелку незадоўга да ўступлення Байдэна на пасаду прэзідэнта», — задаўся пытаннем ён. Дырэктар Цэнтра даследаванняў Расіі, Еўропы і Азіі Тэрэза Фэлан у размове з Politico таксама раскрытыкавала плануемае інвестыцыйнае пагадненне.

«Неверагодна, што Еўрасаюз кінуўся падпісваць інвестыцыйнае пагадненне з Кітаем за некалькі тыдняў да ўступлення на пасаду Джо Байдэна і яго адміністрацыі пры тым, што перад гэтым некалькі гадоў паўтараў пра неабходнасць сумеснай трансатлантычнай палітыкі ў адносінах да КНР», — выказаў прэтэнзіі Вашынгтона да саюзнікаў старшы супрацоўнік Брукінгскага інстытута Том Райт.

### Каласальнае дасягненне

Афіцыйныя асобы ЕС выказваюць нязгоду з крытыкай у дачыненні да паспешнасці заключэння здзелкі без кансультацый з ЗША, падкрэсліваючы, што Белы дом заключыў сваю гандлёвую і інвестыцыйную здзелку пры Дональдзе Трампе. ЕС жа наўпрост спрабуе дамагчыся аналагічных умоў доступу на кітайскі рынак, якія дазволілі б Брусселю і Вашынгтону каардынаваць сваю палітыку ў дачыненні да Кітая.

Летась у снежні на сустрэчы паслоў ЕС генеральны дырэктар па гандлі Еўракамісіі Сабіна Вэянд падкрэсліла, што Брусель, нягледзячы на пярэчанні ў ЗША, усё роўна плануе падпісаць інвестыцыйнае пагадненне з Кітаем да канца года. «Еўрасаюзаўскія паслы віталі прагрэс у перагаворах паміж Бруселем і Пекінам, — заявіў адзін з еўрапейскіх дыпламатаў. — Ні адна дэлегацыя не назвала ніводнай прычыны, якая магла б перашкодзіць падпісанню пагаднення».



Як паведамляе Politico, менавіта Ангела Меркель мела вырашальную ролю ў завяршэнні перамоў з Кітаем. Для канцлера інвестыцыйная здзелка з Пекінам — гэта стратэгічная перамога і найбольш годнае завяршэнне старшынства Германіі ў Савеце ЕС, адзначыў у размове з gazeta.ru дацэнт кафедры еўрапейскага права МДІМА, дырэктар Цэнтра еўрапейскай інфармацыі Мікалай Тапарнін. «Вядома, Германія хацела б паставіць такую тлустую кропку ў гэтым перамоўным працэсе з Кітаем», — адзначыў ён. Старшынства Германіі ў Савеце ЕС скончылася 31 снежня. Аднак, па словах эксперта, Берлін кіраваўся не толькі сваімі амбіцыямі ў імкненні заключыць пагадненне з Кітаем. Менавіта гэтую ініцыятыву Меркель паставіла ў цэнтр павесткі старшынства Германіі. «Я лічу правільным і важным імкнуцца да добрых стратэгічных адносін з Кітаем», — заявіла яна 14 верасня мінулага года. Менавіта на гэты дзень быў запланаваны саміт ЕС—Кітай, які прыйшлося адмяніць з-за пандэміі.

«Сёння многія еўрапейскія, аўтамабілебудаўнічыя, у першую чаргу, кампаніі ўжо прысутнічаюць на кітайскім рынку, выпускаючы вялікую колькасць аўтамабіляў. Для іх гэта вельмі важны рынак. То-бок, у дзвюх краін-лакаматываў Еўрасаюза, экспартаарыентаваных — гэта Германія і Францыя — безумоўна, вельмі вялікі інтарэс у тым, каб атрымаць свабодны доступ на кітайскі рынак», — лічыць Мікалай Тапарнін.

Аднак і гэтым не абмяжоўваецца цікавасць Берліна. Пагадненне ЕС і Кітая, якое прыйшлося не даспадобы ЗША, выходзіць далёка за рамкі гандлёвых адносін Берліна і Пекіна. Перамовы вяліся на фоне пагаршэння эканамічных адносін Паднябеснай і Злучаных Штатаў. Абраны прэзідэнт ЗША Джо Байдэн яшчэ раней даў зразумець, што не мае намеру змякчаць гандлёвую палітыку адносна Пекіна і ў гэтым пытанні ён разлічвае на падтрымку саюзнікаў.

«Амерыканцы разлічвалі дамовіцца з ЕС, каб сумесна аказваць ціск на Кітай, але карціна атрымалася іншая. Еўрапейцы ўжо стаміліся ад гэтых кульбітаў амерыканскай адміністрацыі, ім не падабаецца гэтая пазіцыя. Яны бачаць, што і Байдэн не прапаноўвае ім нейкага глыбокага ўсеабдымнага пагаднення аб стратэгічным партнёрстве. Еўрапейцам абсалютна не падабаецца сябраваць з амерыканцамі супраць Кітая — гэта іх зусім не задавальняе», — адзначыў эксперт.

Адзін з еўрапейскіх дыпламатаў заўважыў Politico, што гандлёвае пагадненне ЕС і КНР паставіць Брусель з Вашынгтонам на адзін узровень. «Яны самі ідуць на пагадненне з Кітаем у надзеі на тое, што менавіта еўрапейскія кампаніі атрымаюць перавагу перад амерыканскімі кампаніямі. Байдэн, відавочна, будзе ўзмацняць эканамічны ціск на Пекін, але еўрапейцы абскакалі ЗША, таму што атрымаць доступ да другога па велічыні магутнага і надзвычай дынамічнага эканамічнага рынку — гэта вельмі вялікае дасягненне, каласальнае дасягненне», — падкрэсліў Мікалай Тапарнін.

### Шлях да суверэнітэту

ЕС усё больш усведамляе сябе асобным гульцом у глабальным свеце, і рознагалоссі паміж 27 краінамі менш значныя, чым агульныя інтарэсы ў XXI стагоддзі, заўважаюць эксперты. Падобна на тое, Пекін згодны з такім падыходам. Пры гэтым ціск Штатаў на Еўрасаюз насіў у апошнія гады сістэмны характар, адзначыла zvezdaweekly.ru. 1 чэрвеня 2018 года ЗША ўвялі для ўсяго свету мытныя пошліны на ўвоз сталі (25 працэнтаў) і алюмінію (10 працэнтаў) як на стратэгічна важную прадукцыю. Еўрасаюз, нягледзячы на настойлівыя просьбы, тут таксама не стаў выключэннем, хоць раней лічыўся Штатамі прасторай, неад'емна звязанай з імі агульнымі стратэгічнымі інтарэсамі. У сваю чаргу Еўракамісія ўвяла ў адказ пошліны на джынсавую вопратку, тытунёвыя вырабы, кукурузу, рыс, журавіны, экспартаваныя з ЗША.

У кастрычніку 2019 года ЗША аб'явілі аб увядзенні адчувальных штрафных пошлін супраць ЕС у сувязі з незаконнымі субсідыямі Еўрасаюза для авіябудаўнічага канцэрна Airbus, нагадвае zvezdaweekly.ru. У кастрычніку мінулага года Сусветная гандлёвая арганізацыя дазволіла Еўрапейскаму саюзу ўвесці пошліны на тавары з ЗША ў адказ на санкцыі Вашынгтона, што звязана з разборам па справе незаконнага фінансавання кампаніі Boeing урадам Злучаных Штатаў.

Так 45-ы прэзідэнт ЗША з дапамогай пошліннай вайны паслядоўна дэфармаваў само мысленне еўрапейцаў, раней дзесяцігоддзямі звыклых дзейнічаць на полі сусветнай эканомікі ў адной запрэжцы са Штатамі, ідучы на тыя ці іншыя дамоўленасці з астатнім светам з улікам інтарэсаў Вашынгтона, заўважае zvezdaweekly.ru. Аднак усё перавярнула чатырохгадовае праўленне Трампа: у Еўрасаюза за мінулы час у такім ракурсе сфарміравалася зусім іншая інерцыя.

Як адзначае Le Monde, глабальнае інвестыцыйнае пагадненне паміж Пекінам і Бруселем з'яўляецца для Еўропы стратэгічна важным. Яно не толькі адкрывае для ЕС вялізны кітайскі рынак, але і сведчыць аб большай самастойнасці Еўрасаюза. «Дамоўленасць, — піша Le Monde, — сведчыць аб фарміраванні еўрапейскага суверэнітэту, які выкарыстоўвае гандлёвыя перагаворы (гэта кампетэнцыя Еўракамісіі) як інструмент знешняй палітыкі для прасоўвання сваіх экалагічных і сацыяльных нормаў».

### Змена лідара

Па выніках мінулага года Кітай абышоў Злучаныя Штаты ў якасці найбуйнейшага гандлёвага партнёра Еўрапейскага саюза. Аб'ём гандлю паміж ЕС і КНР ацэньваецца больш чым у мільярд еўра ў дзень, паведаміў expert.ru. «Пагадненне паглыбіць эканамічныя сувязі паміж Кітаем і ЕС, і цяпер цалкам чаканым наступным крокам становяцца перамовы аб падпісанні паміж бакамі ўсеабдымнага пагаднення аб зоне свабоднага гандлю (FTA)», — заўважыў выданню South China Morning Post дырэктар Цэнтра амерыканскіх даследаванняў Фуданьскага ўніверсітэта ў Шанхаі У Сіньбо.

Дын Чунь, дырэктар Цэнтра еўрапейскіх даследаванняў Фуданьскага ўніверсітэта, пагадзіўся, што здзелка ўяўляе сабой нешта значна большае, чым проста інвестыцыйны пакт. «Гэта дасць істотную перавагу для еўрапейскіх інвестыцый і тэхналогій. Дасць [еўрапейскім фірмам] больш шанцаў выйсці на кітайскі рынак і ўзмоцніць канкурэнцыю паміж кітайскімі і еўрапейскімі інвестарамі», — адзначыў эксперт.

«Пагадненне вельмі важнае для ажыўлення еўрапейскай эканомікі, улічваючы амаль поўнае згасанне цэлых сектараў яе бізнесу. Ёй патрэбны прыток сродкаў з Кітая, — падкрэсліў ng.ru в.а. дырэктара Інстытута Далёкага Усходу РАН Аляксей Маслаў. — Гэта вельмі падобна на сітуацыю 2008—2009 гадоў. Тады пачаўся эканамічны крызіс сусветнага маштабу. Не толькі Еўропа, але і, напрыклад, Цэнтральная Азія мелі патрэбу ў капіталах. Тады Кітай здзейсніў першы буйны прарыў на замежныя рынкі. Цяпер прыкладна такая ж гісторыя. Акрамя кітайскіх іншых буйных крыніц інвестыцый знойдзена не было. Таму Еўропа ідзе, па сутнасці, на аднаўленне ўзаемадзеяння з Кітаем».

Здзелка Пекіна і Бруселя замацоўвае два найважнейшыя трэнды: стратэгічную аўтаномію Еўрасаюза ад Вашынгтона і зрух цэнтра сусветнага эканамічнага развіцця ў Азію, заўважае bloknot.ru. Інвестыцыйнае пагадненне можа пракласці шлях стратэгіі Пекіна «Зроблена ў Кітаі 2025», якая заключаецца ў тым, каб ліквідаваць тэхналагічнае адставанне ад Захаду, застаючыся пры гэтым часткай глабальнага ланцужка паставак, лічаць эксперты. Летась кітайскі ўрад выступіў з шэрагам важных ініцыятыў па падтрымцы нацыянальнай эканомікі.

Калі стратэгічная дамова паміж ЕС і КНР будзе ратыфікавана і ў поўнай меры пачне выконвацца, гэта патэнцыйна можа дапамагчы Кітаю абысці Злучаныя Штаты, заявіў Уінстан Ма, ад'юнкт-прафесар права Нью-Ёркскага ўніверсітэта ў інтэрв'ю CNBC. Эксперт прагназуе, што пагадненне будзе ратыфікаванае на працягу гэтага года.

**Захар БУРАК.**

алімпіец
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



# У ЧЫМ ФЕНОМЕН ГАРНАЛЫЖНАГА СПОРТУ Ў БЕЛАРУСІ?



## ГОР НЯМА, А СПОРТ ЁСЦЬ

**Гарналыжны спорт у нас пачаўся з пасёлка Зялёнае, дзе ў 1955 годзе энтузіясты-аматары Віктар Падшыбякін, Анатоль Алтухоў і Юрый Пярмінаў арганізавалі першыя спаборніцтвы. Адзін з трох бацькоў-заснавальнікаў гарналыжнага спорту Юрый Пярмінаў стаў першаадкрывальнікам знакамітай трасы ў пасёлку Раўбічы. Віктар Падшыбякін — трэнер першай зборнай каманды. У 1960-х гарналыжны спорт стаў набіраць хуткасць — спартсмены пачалі паказваць першыя поспехі на міжнародных спаборніцтвах, фарміраваліся судзейскія брыгады, удасканальвалася інфраструктура.**

### ПРАДАЎЖАЕ ЖЫЦЬ І РАЗВІВАЦЦА

У 1998 годзе беларускія гарналыжнікі ўпершыню выступілі на Алімпійскіх гульнях у японскім Нагана, Ігар Юдзін фінішаваў 36-м у супергіганце. Па заканчэнні спартыўнай кар'еры ён стаў першым старшынёй Беларускай федэрацыі гарналыжнага спорту і сноўборда і здзівіў многіх, даказваючы, што гарналыжнікі могуць трэніравацца і на беларускім рэльефе. І як паказала практыка, меў рацыю. У 2010 годзе на Алімпійскіх гульнях у канадскім Ванкуверы Беларусь прадстаўлялі Марыя Шканава і Лізавета Кузьменка. У алімпійскі Сочы разам з Марыяй Шканавай адабраўся Юрый Данілачкін. Беларускі дуэт прадстаўляў краіну і на Алімпійскіх гульнях 2018 года ў карэйскім Пхёнчхане.

Праз 66 гадоў гарналыжны спорт у Беларусі працягвае жыць і развівацца, дзякуючы энтузіязму спартсменаў, трэнераў і кіраўніцтва. Скептыкам гэта можа здацца алагічным — як у краіне, дзе гара Дзяржынская вышынёй 345 метраў лічыцца самым высокім пунктам, можна развіваць гарналыжны спорт. Аднак адсутнасць гор не перашкода. **Начальнік каманды — старшы трэнер нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па гарналыжным спорце і сноўбордзе Аляксандр НАКАНЕЧНЫ** расказаў, чым жыве гарналыжны спорт і ці сапраўды яго аснова — энтузіязм усіх датычных.

«Многія лічаць, што развіваць гарналыжны спорт можна толькі там, дзе ёсць горы. У Беларусі створаны ўмовы для развіцця горных лыжаў і сноўборда і далучэння насельніцтва да гэтых відаў спорту. У нас ёсць цэнтры з неабходнай інфраструктурай — гарналыжны цэнтр «Сонечная даліна» ў Мінску, цэнтры ў Раўбічах, Сілічах, Лагойску, Віцебску, Магілёве, Мазыры, Гродне. Гэтых умоў дастаткова для пачатковага этапу падрыхтоўкі спартсменаў да 12 гадоў. Далей падрыхтоўка спартсменаў пераносіцца ў горныя краіны для трэніровак на больш крутых і працяглых схілах. Прафесійным спартсменам патрэбны больш яўныя перапады вышынь і больш працяглыя трасы з рознымі варыянтамі падсцілаючай паверхні, (напрыклад, залітыя вадой ледзяныя трасы), чым ёсць на нашых аб'ектах. Гэтае пытанне можна вырашыць, калі ёсць дадатковыя рэсурсы», — адзначае Аляксандр Наканечны.

Навучыцца азам гарналыжнага спорту можна ў многіх мясцінах раўніннай тэрыторыі Беларусі. Дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы з аддзяленнямі гарналыжнага спорту і сноўборда ёсць у сталіцы і Мінскай вобласці, Магілёве. У спецыялізаваных вучэбна-спартыўных установах займаецца каля 200 дзяцей па ўсёй краіне. На жаль, толькі адзінкі вырастаюць у прафесійных спартсменаў.

Усяго ў гарналыжным спорце шэсць дысцыплін. У Беларусі развіваюцца толькі тэхнічныя: слалам, паралельны слалам і слалам-гігант. Слалам прадугледжвае спуск з гары на лыжах па трасе даўжынёй 450—500 метраў, размечанай варотамі. Падчас праходжання трасы спартсмен павінен праехаць праз усе вароты. Слалам-гігант мае такі ж самы прынцып і адрозніваецца патрабаваннямі да трасы. Для слалама перапад вышынь паміж стартам і фінішам павінен быць 60—150 метраў, у слаламе-гіганце — ад 300 метраў. Развіваць хуткасныя дысцыпліны, напрыклад скарасны спуск, у Беларусі немагчыма. У краіне няма схілаў з патрэбнай працягласцю і перападам вышынь. Такія дысцыпліны папулярныя ў альпійскіх краінах, дзе гэта дазваляюць прыродныя ўмовы. Стварыць іх штучна — складана і дорага.

### ТРЭНАЖОР — СЯБАР БЕЛАРУСКАГА ГАРНАЛЫЖНІКА

Да спаборніцтваў беларускія гарналыжнікі рыхтуюцца за мяжой. А ўдасканальваць фізічную форму яны могуць дома. У Раўбічах ці ў гарналыжным цэнтры «Сонечная даліна» ёсць усе неабходныя ўмовы для паўнацэнных і плённых заняткаў агульнай і спецыяльнай фізічнай падрыхтоўкай, катання на роліках, адпрацоўкі скачкоў. Спецыяльны трэнажор IMOOVE, усталяваны ў «Сонечнай даліне», развівае і ўдасканальвае мноства спецыяльных якасцяў спартсмена. «Трэнажор поўнасцю капіруе біямеханіку і фізіку руху на лыжах. На ім можна праверыць свае сілы, рыхтаваць мышцы да нагрузак, бо ўсё пачынаецца з іх. Працуючы на ім, можна добра развіць свой фізічны стан. Атрыманыя на ім навыкі лёгка прымяняюцца на трасе. З дапамогай трэнажора спартсмен псіхалагічна настройваецца да адчування сябе на лыжах. А калі чалавек гатовы і псіхалагічна, і фізічна, траўматызм зводзіцца да мінімуму», — расказвае Аляксандр Наканечны.

На такім трэнажоры найлепшыя гарналыжнікі рыхтуюцца да спаборніцтваў. А для няспешчанай снегам Беларусі, ён незаменны на ўсіх перыядах падрыхтоўкі. Хоць зразумела, што ні адзін трэнажор цалкам не заменіць горы.

### ПРЫМА ГАРНАЛЫЖНАГА СПОРТУ

У беларускага гарналыжнага спорту — жаночае аблічча, аблічча Марыі Шканавай. Яна — лідар і галоўная надзея спорту. Марыя — адзіны член нацыянальнай каманды, і асноўная ўвага ўдзяляецца менавіта ёй. «Падрыхтоўка спартсменаў сусветнага ўзроўню патрабуе значных фінансавых сродкаў — трэніровачныя зборы, спаборніцтвы, экіпіроўка. Таму мэтазгодна сканцэнтравацца на спартсмене, які ўжо не раз пацвярджаў сваё спартыўнае майстэрства і можа дасягнуць высокіх вынікаў», — тлумачыць Аляксандр Наканечны.

З 2008 года ўраджэнка расійскага Магнітагорска выступае за Беларусь. За 12 гадоў яна выступіла на трох Алімпійскіх гульнях, завявала поўны камплект узнагарод Сусветнай універсіяды 2017 года, паказала высокія вынікі на многіх міжнародных спаборніцтвах. Цяпер Марыя выступае на этапах Кубка свету, рыхтуецца да чэмпіянату свету, запланаванаму на люты. На планетарным першынстве Марыя будзе выступаць у трох дысцыплінах — сваім любімым слаламе, слаламе-гіганце і паралельным гігантскім слаламе. Новы год пачаўся для Марыі паспяхова, у пачатку студзеня на этапе Кубка Еўропы яна заняла 9-е месца — гэта найлепшы асабісты вынік на этапах Кубка Еўропы.

«Вядома, мне хочацца, каб у нашай нацыянальнай камандзе была канкурэнцыя, толькі так можна паляпшаць свае вынікі. Непасрэдна на лыжах я заўсёды трэніруюся за мяжой побач з іншымі камандамі, таму нават па-за спаборніцтвамі мне хапае канкурэнцыі. Цяпер у Беларусі ёсць перспектыўныя дзеці, з якіх у будучым пры правільным падыходзе могуць вырасці моцныя гарналыжнікі.

На папярэднім этапе Кубка Еўропы я паказала сапраўды добры вынік. Але, як і любому спартсмену, мне хочацца большага. Цяпер я планамерна рыхтуюся да чэмпіянату свету, напярэдадзе яшчэ некалькі этапаў Кубка Еўропы. Некаторыя моманты яшчэ трэба дапрацаваць. Зараз у мяне шмат сходаў, я не даязджаю да канца трасы і дапускаю памылкі. Мы з трэнерам мяркуем, гэта звязана з тым, што ў падрыхтоўчы перыяд праз пандэмію каранавіруса я мала стаяла на лыжах, бо пазней пачала спецыяльную падрыхтоўку. Мы актыўна над гэтым працуем, і да чэмпіянату свету ўсе недахопы будуць выпраўлены.


Марыя ШКАНАВА.

Усе мае мэты на 2021 год звязаны са спортам. Пасля чэмпіянату свету пачну рыхтавацца да Алімпійскіх гульняў 2022 года ў Пекіне. Ліцэнзія ў мяне ўжо ёсць, план-мінімум выкананы, і я думаю аб плане-максімуме — не проста паехаць на Алімпіяду, а паказаць там дастойны вынік», — падзялілася Марыя Шканава.

### АДЗІН НА ТРАМПЛІНЕ ВОІН

Разам з гарналыжным спортам развіваецца і сноўборд. У краіне папулярныя дзве дысцыпліны: слоўпстайл і біг-эйр. Абедзве прадугледжваюць выкананне акрабатычных трукаў падчас скачка з трампліна. Розніца ў тым, што ў сплоўпстайле скачкі выконваюцца на трамплінах, контр-нахілах, парэнчах, паслядоўна размешчаных на працягу трасы. Абедзве дысцыпліны — алімпійскія. Пакуль з беларускіх спартсменаў на алімпійскае выступленне можа прэтэндаваць толькі Павел Анішчанка. У 2017 годзе ён заваяваў першы для Беларусі мужчынскі медаль еўрапейскага ўзроўню — бронзу этапу Кубка Еўропы. Зараз галоўная мэта спартсмена — заваяванне ліцэнзіі на Алімпійскія гульні 2022 года ў Пекіне. Па словах Аляксандра Наканечнага, задача амбіцыйная, але рэальная.

«Павел Анішчанка — наш самы яскравы сноўбардзіст, ён жа член нацыянальнай каманды. Астатнія пакуль падцягваюцца да яго ўзроўню. У нашай краіне ёсць умовы для развіцця спартсменаў. У нас ёсць глабальныя задумкі па аснашчэнні Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовым відах спорту «Раўбічы» нахільнай паветранай падушкай. Сусветная практыка развіцця сноўборда паказвае, што яна дазваляе павышаць складанасць скачкоў і лепей рыхтавацца да спаборніцтваў. Да таго ж, такая падушка сэканоміць грошы на вучэбна-трэніровачныя зборы на замежных аналагічных базах. Такім чынам, мы плануем стварыць сваю базу для развіцця сноўборда, што прыцягне больш людзей да гэтага віду спорту.

Сноўборд — складанакаардынацыйны спорт, да таго ж ён суб'ектыўны. Сноўборд — гэта не толькі спорт, гэта спосаб жыцця. Паспяховыя спартсмены жывуць на схіле, пастаянна катаюцца, слізгаюць «фігурамі», скачуць з усяго, з чаго можна. Для папулярызацыі свайго спорту яны ініцыююць стварэнне паркаў, летам трэніруюцца на вейкбордзе», — расказвае Аляксандр Наканечны.

### ВЕК ЖЫВІ — ВЕК ВУЧЫСЯ

У сучасным спорце нікога не здзівіць запрашэннем легіянераў. Не навіна гэта і для гарналыжнага спорту. Разам з Марыяй Шканавай на Алімпійскія гульні ў Сочы і Пхёнчхан ездзіў Юрый Данілачкін, які ў 2010 годзе змяніў расійскае спартыўнае грамадзянства на беларускае. Па словах старшага трэнера нацыянальнай каманды, за 11 гадоў падыход змяніўся: «Цяпер мы стараемся мінімізаваць практыку запрашэння легіянераў. Калі запрашаем спартсмена, трэба разумець, што ў яго ўжо ўклалі працу, фінансы, заклалі пэўныя навыкі. Так, а чаму мы не можам рабіць тое ж самае? Цяпер мы шукаем таленавітых дзяцей у рэгіёнах, каб вырасціць з іх будучых моцных спартсменаў. Так, для гэтага патрэбны рэсурсы, але нам дапамагае Міністэрства спорту і турызму, мы прыцягваем спонсараў. У спорце нічога не атрымліваецца, калі проста пстрыкнуць пальцамі, трэба пастаянна працаваць».

Супрацоўніцтва з замежнымі калегамі ў Беларускай федэрацыі гарналыжнага спорту і сноўборда інтэлектуальнае. Аляксандр Наканечны ўпэўнены, без абмену вопытам нічога не атрымаецца: «Адна з найлепшых школ гарналыжнага спорту — славенская. У іх высакакласныя спецыялісты, самая свежая інфармацыя. Яны пастаянна праводзяць даследаванні і не баяцца ўкараняць інавацыі. Ёсць чаму павучыцца ў калег з Аўстрыі, ЗША, Швейцарыі, Нарвегіі, Швецыі — яны сусветныя лідары. Мы стараемся браць нешта карыснае і тое, што падыходзіць нам ад кожнай школы, каб беларускія спартсмены маглі засвойваць і прымяняць найлепшыя тэхнічныя прыёмы і ўдасканальваць якасць сваіх выступленняў. Працы шмат і ў спартсменаў, і ў трэнераў, і ў федэрацыі, але пад'ём наверх лёгкі не бывае».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота Беларускай федэрацыі гарналыжнага спорту і сноўборда.**

## Дзмітрый ХОДАС:

# «Воля, характар і любоў»

## Як не быць алімпійскім чэмпіёнам, але быць героем спорту

**У аснове алімпізму заўжды была бязмежная сіла чалавечага духу. Без яе не было б гучных перамог, рэкордаў, Алімпійскіх гульняў, ды і самога спорту — усяго, ад чаго ва ўсяго свету займае дух. Гэта гісторыя менавіта такая, у яе цэнтры — малады хлопец, які не проста нікога не пакіне раўнадушным, але і навучыць кожнага быць мацнейшым за абставіны і нават сам лёс.**

Чэмпіянат Еўропы 2019 года для юнацкай зборнай па цяжкай атлетыцы выдаўся ўраджайным — шмат медалёў, пяць сусветных, 40 еўрапейскіх і 50 нацыянальных рэкордаў. Але радасць ад гэтага патухла на фоне аднаго выступлення. На трыумфатара турніру, уладальніка «бронзы» па суме двухбор'я і малога «золата» ў рыўку Дзмітрыя Ходаса ўпала штанга. У трэцяй спробе ў штуршку ён заявіў вагу ў 146 кілаграмаў, але, страціўшы кантроль, упаў, а штанга ўпала на яго. З таго часу Дзіма не можа хадзіць. Але каварнаму снараду не ўдалося задавіць яго характар і любоў да спорту.

Зараз Дзмітрый праводзіць трэніровачны збор у Мінску. Разам з ім з Хойнікаў прыехаў першы трэнер і сябар Віктар Саракалетаў. «Пакуль я не магу дакладна і цвёрда сказаць, ці буду я далей займацца спортам. Гэты збор патрэбны, каб яшчэ раз усё ўзважыць і прыняць рашэнне. Але я не магу ўявіць сваё жыццё без спорту. Сёлета я паступіў на завочную форму ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, хутка пачнецца першая сесія. Таму праз некалькі гадоў змагу працаваць трэнерам. Раней я ўжо дапамагаў сябру трэніравацца, і мне падабаецца гэта дзейнасць. Аднак гэта ўсё роўна спорт. Ні ў якай іншай сферы я сябе ўявіць не магу», — расказвае Дзмітрый.

### «НЕ ПУСЦІШ У ВУЧЫЛІШЧА — УЦЯКУ З ДОМУ»

Спортам Дзмітрый займаецца палову свайго жыцця — з дзевяці гадоў, зараз спартсмену 18: «Спачатку я хадзіў на дзюдо, але яно мяне не зачапіла, не склаліся адносіны з трэнерам. Мая «кар'ера» дзюдаіста скончылася недзе праз тыдні два пасля пачатку. Калі я быў у трэцім класе, да нас на ўрок прыйшоў трэнер і запрасіў усіх ахвотных у секцыю цяжкай атлетыкі. Мне было гэта нецікава. Але, калі праз два тыдні ён прыйшоў зноў, мне стала цікава, што ж гэта за цяжкая атлетыка такая, і я пачаў займацца». Любові з першага погляду ў іх не атрымалася, зусім хутка Дзмітрыю надакучыла. Але трэнер Віктар Саракалетаў адзначыў здольнасці хлопчыка і, як бачна, не прагадаў. «Праз нейкі час, пасля таго, як я закінуў цяжкую атлетыку, Віктар Уладзіміравіч прыехаў да маёй мамы. Ён упэўніў і мяне, і яе, што ў мяне ёсць талент і я павінен працягваць. Мы паслухалі трэнера, і я вярнуўся ў залу. Пасля першай перамогі на гарадскіх спаборніцтвах зразумеў, што я хачу займацца цяжкай атлетыкай і дасягаць высокіх вынікаў».

Па словах Дзмітрыя, трэніроўкі ў той час прыносілі адно задавальненне. Канешне, была дысцыпліна, якую юныя спартсмены часам парушалі. «Мне пашанцавала з першым трэнерам. Віктар Уладзіміравіч быў з намі на адной хвалі. Пасля трэніровак мы часта гулялі з ім у футбол, у хованкі. Ён нармальна ставіўся да нашых не самых прыкладных паводзін. Памятаю такі выпадак. Трэнер быў заняты, а мы з сябрамі гулялі ў футбол у іншай зале. Каля сцяны стаялі спартыўныя маты, і мы з сябрам за іх схаваліся. А яшчэ адзін сябар паклікаў трэнера і сказаў, што мы зніклі. Канешне, трэнер разгубіўся. А калі ён адвярнуўся, мы вылезлі і пачалі даказваць, што ўвесь час былі менавіта ў гэтай зале. Ён спачатку разазлаваўся, а потым разам з намі пасмяяўся», — успамінае Дзмітрый.

Поспехі Дзмітрыя на абласных спаборніцтвах пасадзейнічалі таму, што ў 2016 годзе яго запрасілі ў Бабруйскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву, дзе створаны выдатныя ўмовы для заняткаў цяжкай атлетыкай. На той час хлопец ужо цалкам жыў спортам. Прызнаецца, спачатку здавалася, што ў вучылішчы будзе цяжка, без сям'і, з іншым трэнерам. Але потым зразумеў, што гэта важны этап у спартыўным жыцці, які трэба прайсці, каб дасягнуць спартыўных вяршынь.

Маме перспектыва аддаць сына ў такім малым узросце ў вучылішча не вельмі спадабалася. «Мама заўсёды падтрымлівала мае заняткі спортам, ганарылася поспехамі. Але, мабыць, як і любая маці, яна хацела, каб я вучыўся побач, быў разам з ёй. Толькі я гэтага не хацеў. Па-першае, у нашым горадзе няшмат варыянтаў для атрымання адукацыі. А па-другое, я вельмі хацеў вучыцца менавіта ў вучылішчы алімпійскага рэзерву. Я абураўся: усе, з кім я трэніраваўся, паступаюць, а мяне мама не адпускае, як гэта так. Мы шмат спрачаліся наконт гэтага. Я нават пагразіў, што, калі мама



Дзмітрый ХОДАС.

мяне не адпусціць, уцяку з дому. І ведаеце, уцёк бы, потым, вядома б, вярнуўся. Я ўпэўнены, калі б мама не пусціла мяне ў Бабруйск, я быў бы вельмі на яе пакрыўджаны», — дзеліцца Дзмітрый.

У 15 гадоў Дзмітрый выканаў нарматыў на званне кандыдата ў майстры спорту. А пасля юнацкага чэмпіянату Еўропы 2019 года яму прысвоена званне майстра спорту. З канца 2020 года Дзмітрый — заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь.

### УСЕ ЗА АДНАГО

Па словах Дзмітрыя, вялікую ролю ў яго жыцці адыгрываюць сябры. З найлепшым сябрам Кірылам яны сябруюць яшчэ са школы. Разам займаліся цяжкай атлетыкай, разам парушалі дысцыпліну на трэніроўках і выконвалі практыкаванні, якія трэнер даваў як пакаранне. Цяпер Кірыл вучыцца ў Мазыры, дзе абараняе спартыўны гонар вучылішча. Але розныя гарады мужчынскаму сяброўству не перашкаджаюць.

«Са школьных часоў у мяне засталіся тры сябры і дзве сяброўкі. Нават не магу сказаць, колькі гадоў мы разам. Яны вельмі моцна мяне падтрымліваюць і мне дапамагаюць. На мой погляд, сяброўства паміж хлопцам і дзяўчынай існуе, я ў гэтым упэўніўся на сваім прыкладзе. У мяне шмат сяброў з цяжкай атлетыкі. Мы не маем зносін кожны дзень, але я ўпэўнены, што яны заўжды прыйдуць на дапамогу. Я не магу назваць сябе актыўным спартыўным аматарам, у мяне няма куміраў ці горача любімых спартсменаў. Хоць не, хлушу. Мае любімыя спартсмены — мае сябры», — з гонарам дзеліцца Дзмітрый.

Галоўнымі рысамі сапраўднага сябра хлопец лічыць здольнасць і шчырае жаданне зразумець, падтрымаць і дапамагчы. Сам ён стараецца быць менавіта такім у сяброўскіх адносінах. А сябры ў яго не толькі равеснікі. Дзмітрый расказвае, што дома ў Хойніках ён не спыняў трэніровак. Дапамагае трэнер Віктар Саракалетаў, які кожны дзень наведвае свайго вучня, дае практыкаванні на ногі, прэс, спіну. Ініцыятар і ідэйны натхняльнік збораў у Мінску і



Дзмітрый ХОДАС з трэнерам Віктарам САРАКАЛЕТАВЫМ і сябрам Аляксандрам ТРЫПУЦЕМ.

ўвогуле заняткаў спортам для Дзмітрыя — Аляксандр Трыпуць, вядомы беларускі параалімпіец, бронзавы прызёр Параалімпійскіх гульняў 2016 года. Вопытны спартсмен упэўнены, Дзмітрыю трэба займацца спортам, гэта дапаможа яму не апусціць рукі.

«З Віктарам Уладзіміравічам мы знаёмы даўно. І я лічу яго старэйшым сябрам. Хоць мы і нядоўга знаёмы з Сашам Трыпуцем, але я магу назваць яго сваім сябрам. За кароткі час ён многае зрабіў для мяне. Саша сам мне напісаў, падтрымаў, падарыў спецыяльны трэнажор для ног, многаму мяне вучыць. Прызнаюся, раней я не ведаў пра яго, але потым пачытаў у інтэрнэце. Мне вельмі прыемна, што побач такі чалавек», — адзначае Дзмітрый.

### УСЁ ЦІ НІЧОГА

Калі меркаванне, што нашы сябры — наша адлюстраванне слушнае, то Дзмітрый Ходас — адкрыты, моцны, валявы чалавек. З самага пачатку ў маладога спартсмена была ўстаноўка — заўжды быць першым. А інакш навошта гэта ўсё, упэўнены хлопец: «Я заўжды лічыў, што трэніравацца і змагацца патрэбна для таго, каб быць першым. Мне вельмі важны вынік, хоць і працэс таксама мае значэнне. Таму мне заўсёды цікава спаборнічаць з моцнымі канкурэнтамі, тады ёсць кураж і лёгкі страх, які надае сіл. Хоць і выступаю за сябе, але я нясу адказнасць за тое, што прайграўшы магу падвесці трэнера, каманду».

Імкненне быць першым праяўлялася ў Дзмітрыя яшчэ да спорту. Ён успамінае, што нават у дзіцячых гульнях яму патрэбна было перамагчы. Хлопцу падабаецца падцягвацца, то-бок пастаянна імкнуцца наверх. Спартсмен лічыць, што такі валявы характар у яго ад бацькоў. А спорт яго толькі ўмацаваў і загартаваў. Гэта, бадай, ці не асноўная прычына такой любові.

Дзмітрый адзначае, што спорт навучыў яго не здавацца і быць гатовым да ўсяго. «На спаборніцтвах я хваляваўся, але нікому гэтага не паказваў. Канешне, былі сумненні, што я не змагу падняць пэўную вагу. Можна зрабіць усё, варта толькі захацець і сабраць усе сілы ў кулак. Псіхалагічна я гатовы да ўсяго. Кожны пройгрыш ці няўдача — гэта ўрок, які даецца, каб наступны раз быць мацнейшым», — разважае Дзмітрый.

Пакуль спартсмен не прыняў канчатковага рашэння аб працягу сваёй кар'еры. Трэнер Віктар Саракалетаў адзначае, зараз перад Дзмітрыем адкрыты многія віды спору. На зборы ў Мінску ён лепей пазнаёміўся з параалімпійскімі веславаннем і лёгкай атлетыкай. «Дзіма — моцны малады чалавек, і яму па сілах асвоіць многія віды спорту, але трэба знайсці той, дзе яму будзе максімальна камфортна працаваць. Таму зараз мы ў пошуках. У цяжкай атлетыцы будзе вельмі складана з-за класіфікацыі спартсменаў-параалімпійцаў у гэтым відзе спорту. Дзіма ўніверсальны баец, ён лёгка засвоіць любы спорт. Ён можа кідаць кап'ё, веславаць і яшчэ шмат чаго. Вядома, канчатковае рашэнне будзе за ім. Наша задача — накіраваць яго, дапамагчы вызначыцца. Дапамагае і Дзімаў трэнер з вучылішча Міхаіл Рабікоўскі. Вялікі дзякуй і Сашу Трыпуцю, і Нацыянальнаму параалімпійскаму камітэту за дапамогу, за гэты збор. Для нас з Дзімам гэта абсалютна новы вопыт і добра, што побач ёсць дасведчаныя людзі, якія могуць падказаць і накіраваць. У нас, можна сказаць, пачатак новага жыцця. Але я ў першую чаргу, дзіцяча-юнацкі трэнер. Таму, калі дасць бог, усё будзе добра, Дзіма пойдзе трэніравацца, а я вярнуся да малых. Хлопец многаму мяне навучыў», — расказвае Віктар Саракалетаў.

Адказваючы на пытанне аб крыніцы матывацыі, Дзмітрый Ходас доўга не думае: мая матывацыя — гэта блізкія мне людзі. Я займаюся спортам, раблю ўсё дзеля сваіх блізкіх, сяброў, сям'і, малодшай сястры, мамы».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Продавец**: кооперативное ремонтно-строительное унитарное предприятие «Глубокская передвижная механизированная колонна», 211800, Республика Беларусь, Витебская обл., г. Глубокое, ул. Госпитальная, 3, тел. (02156) 2-18-39.

**Лот № 1**. Транспортное средство MAZ 5337 A, 2010 г. в., тип – грузовой специальный автокран, рег. № АЕ 2800-2, кузов (рама) № Y3M5337A2A0002738, цвет – желтый, инв. № 124. Установлена крановая установка КС-3579-4. **Нач. цена**: 39 780,00 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 3 978,00 бел. руб.

**Торги состоятся**: **23.02.2021 в 11.30 по адресу**: **Витебская обл., г. Глубокое, ул. Госпитальная, 3, в унитарном предприятии «Глубокская передвижная механизированная колонна»**. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 08.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 25.01.2021 с 08.30 по 22.02.2021 до 15.00.**

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» №BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Место нахождение лота: Витебская обл., г. Глубокое, ул. Госпитальная, 3. **Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник) обязан: в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов возместить затраты за организацию и проведение аукциона, расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона, заключить договор купли-продажи в течение 4 рабочих дней с даты проведения торгов, оплатить предмет торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи**. Аукцион проводится в порядке,** установленном Постановлением правления Витебского областного потребительского общества № 149 от 01.07.2020. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка; индивидуальными предпринимателями: копия документа подтверждающего гос. регистрацию; юр. лицами – резидентами РБ: копии учредительных документов и копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица; юр. лицами – нерезидентами РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения и документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, оформленный в соответствии с законодательством РБ документ подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Имущество, бывшее в употреблении. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона отказаться от проведения аукциона. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом в рабочие дни по тел. +37529 892 23 65 Зуй Валерий Владимирович. Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА 23 ФЕВРАЛЯ 2021 ГОДА

Местонахождение недвижимого имущества – **г. Гродно, ул. Индустриальная, 5**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1*** Капитальное строение, инв. № 400/С-86562. Назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электроснабжения 0,4 кВ. Расположено на земельном участке 440100000001007894 (присвоен предварительно) | | | |
| **Начальная цена** | **855,0 руб.** | *Сумма задатка* | *80,0 руб.* |
| **Лот № 2*** Капитальное строение, инв. № 400/С-86563. Назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – кабельная линия 6 кВ. Расположено на земельном участке 440100000001007894 (присвоен предварительно). | | | |
| **Начальная цена** | **657,0 руб.** | *Сумма задатка* | *60,0 руб.* |
| **Лот № 3*** Капитальное строение, инв. № 400/С-101465. Назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция. Площадь – 38,7 кв. м. Одноэтажное здание. Фундамент бетонный. Стены, перегородки – кирпич. Чердачные перекрытия жел. бетонные. Крыша совмещенная рулонная. Полы бетонные. Дверные проемы – металлические ворота. Расположено на земельном участке 440100000001000927 | | | |
| **Начальная цена** | **17 010,0 руб.** | *Сумма задатка* | *1 700,0 руб.* |
| **Лот № 4*** Капитальное строение, инв. № 400/С-49770. Назначение – здание склада, наименование – склад с навесом для арматурной стали. Площадь – 141,50 кв. м Одноэтажное здание. Фундамент бетонный. Стены, перегородки кирпичные. Чердачные перекрытия жел. бетонные. Крыша совмещенная рулонная. Полы бетонные. Дверные проемы – металлические ворота. Составные части и принадлежности: навес. Расположено на земельном участке 440100000001000927 | | | |
| **Начальная цена** | **39 330,0 руб.** | *Сумма задатка* | *3 900,0 руб.* |
| **Лот № 5*** Капитальное строение, инв. № 400/С-101467. Назначение – здание неустановленного назначения, наименование – проходная. Площадь – 14,3 кв. м Одноэтажное здание. Фундамент бетонный. Стены, перегородки кирпичные. Чердачные перекрытия – плита железобетонная. Крыша совмещенная рулонная. Полы – линолеум, бетон. Оконные проемы двойные створчатые. Дверные проемы однопольные глухие. Внутренняя отделка – штукатурка. Расположено на земельном участке 440100000001000927 | | | |
| **Начальная цена** | **9 180,0 руб.** | *Сумма задатка* | *900,0 руб.* |
| **Лот № 6*** Капитальное строение, инв. № 400/С-86571. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – покрытие территории. Составные части и принадлежности: Асф/бет. покрытие (площадь 3561 кв.м) - пр. часть (А), цем. бет. покрытие (площадь 6925 кв.м) - пр. часть (Б), цем. дорожка (площадь 18 кв.м) - пеш. часть; отмостка асф. (площадь 37 кв.м). Расположено на земельном участке 440100000001000927 | | | |
| **Начальная цена** | **30 240,0 руб.** | *Сумма задатка* | *3 000,0 руб.* |
| **Лот № 7*** Капитальное строение, инв. № 400/С-86574. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории. Составные части и принадлежности: ограждение из ж/б плит (I), ограждение из сборных ж/б плит (I), ограждение из мет.сетки на мет. столбах (II), ограждение кирп. сплошное (II), ограждение из мет. сетки на мет. столбах (III), ограждение из мет. сетки на мет. столбах (IV), ворота мет. (1), ворота мет. (2), ворота мет. (3), ворота мет. (4). Расположено на земельном участке 440100000001000927 | | | |
| **Начальная цена** | **15 570,0 руб.** | *Сумма задатка* | *1 500,0 руб.* |
| **Лот № 8*** Капитальное строение, инв. № 400/С-49769. Назначение – материальный склад, наименование – материальный склад. Площадь – 982,7 кв. м Составные части и принадлежности: две пристройки, два навеса, рампа. Одноэтажное здание. Фундамент бетонный. Стены, перегородки – кирпич. Чердачные перекрытия жел.бетонные. Крыша совмещённая рулонная. Полы бетонные. Оконные проёмы – двойные остеклённые. Дверные проёмы – металлические ворота, филёнчат, деревянные ворота. Внутренняя отделка – штукатурка, покраска. | | | |
| **Начальная цена** | **192 600,0 руб.** | *Сумма задатка* | *19 000,0 руб.* |

* – Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Аукцион состоится 23 февраля 2021 года в 15.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **с 25 января по 17 февраля 2021 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056.

Адреса сайтов: grodno.gov.by, gcn.by, gki.gov.by

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

## Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ

**1) Объекты бывшего военного городка, комплекс № 1: здание контрольно-технического пункта, заправочного пункта, хранилищ техники, эстакады автомобильные с инженерными сетями, объектами благоустройства по ул. Красноармейской, 53, 53/1-53/13 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 752 285 руб. 69 коп.

Размер задатка – 75 300 руб.

**2) Объекты бывшего военного городка, комплекс № 3: пункт технического обслуживания и ремонта с пристройкой, здание АЗС № 29, столярная мастерская с инженерными сетями, объектами благоустройства около г. п. Россь Росского с/с, 33, 33/1, 33/2 Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 187 720 руб. 25 коп.

Размер задатка – 20 000 руб.

**3) Объекты бывшего военного городка, комплекс № 4: бытовой домик АЭР; склад НЗ с подвалом и боксом на 10 м/м и мощением; гараж техники с котельной, пристройкой, площадкой; контрольно-технический пункт парка АЭР с наружной водопроводной сетью около г. п. Россь Росского с/с 39, 39/1, 39/2, 39/3 Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 165 665 руб. 31 коп.

Размер задатка – 17 000 руб.

**4) Объекты бывшего военного городка, комплекс № 5: подъездной путь «в/97100» около деревни Студенец; хранилища ГСМ № 2, хранилище спецжидкостей объектами благоустройства около г.п. Россь Росского с/с, 45, 45/1 Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 234 373 руб. 98 коп.

Размер задатка – 24 000 руб.

**5) Объекты бывшего военного городка комплекс № 11: медпункт, штаб с пристройкой и 2 террасами, штаб с пристройкой с инженерными сетями, объектами благоустройства по ул. Красноармейской, 51, 51/1, 51/2 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 238 412 руб. 27 коп.

Размер задатка – 25 000 руб.

Аукцион состоится – **18.02.2021 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39.

